КАЛОСЬСЕ



«КАЛОСЬСЕ»—беларускі літаратурна-навуковы і грамадзкі часапіс. Выходзіць раз у тры месяцы. Складка ў год—2 зл.
— Асобная кніжка — 50 гр. Заграніцу цана — падвойная. —
Адрыс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Завальная вул. 1—2.

«KAŁOŚSIE» — białoruski literacko - naukowy i społeczny kwartalnik. — Wilno, Zawalna 1—2.

«KALOŚSIE» — blancruthenienne revue trimensuelle litteraire et scientifique. Wilno, Zawalna 1—2. Pologne.

Зьмест кніжкі 1 (14) „Калосься“

Вокладку запраектавала і выканала В. Пракаповічанка

Бел. Друкарня ім. Фр. Скарыны, Вільня, Завальная вул. 1—1.

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ І ГРАМАДЗКІ ЧАСАПІС

Выходзіць кніжкамі раз на тры месяцы

1938 год — IV год выданьня

Кніжкі 1 (14) — 4 (17)

Redaktor - Wydawca: JAN SZUTOWICZ

Рэдактар - Выдавец: ЯН ШУТОВІЧ

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Завальная 1—2.

Drukarnia Białoruska im. Fr. Skaryny — Wilno, ul. Zawalna 1.

ЗЬМЕСТ

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ І ГРАМАДЗКІ ЧАСАПІС

Кніжка 1 (14) 1938 г. Год IV

МАКСІМ ТАНК

КАЛІНОЎСКІ

(ПАЭМА)

1

Паўночны вецер

З поўначы вецер
зьніжаным лётам
рве хмараў вячэрніх цяжкія плыты,
калышучы мачтаў п'яны готык
і цёмна — імглісты цень густы.
У гэткі час і пагутарыць не з кім, —
хоць-бы аб родным шолаху ніў...
Вось на шырокім і шумным Неўскім
мокрыя вечар агні запаліў.
Горад шуміць, вялікі горад,
шэры граніт, камяніцы, муры
і гэты назойлівы звон штораў,
і эпалеты, лампасы, арлы...
Тронам — вастрогам край прыдавіла,
моцна калёны палацаў стаяць.
Здаецца, ці можна гэткую сілу
нат' гневам народным калі ўзарваць!

З поўначы вецер
у месяцы човен
плёскае сінія хвалі Нявы...
Пэўна таксама дзесь стары Нёман
з пены кудлатую грыву завіў.
Пэўна дзесь дрэмлюць хаты — зямлянкі,

цемру калыша лучыны агонь,
гора складае свае калыханкі, —
сумныя песьні пра чорны прыгон..
Але бяз лямкі шырокай праз грудзі,
шматмільённы народзе ты мой,
некалі сонца сабе на палудзень
паложыш на столе мазольнай рукой!
Недзе ў глушы, за парогам сасновым
моліцца, ночы ня сьпіць жняя...
Можа ты сяньня цень Пугачова
песьняй калышаш, вёска мая?..

З поўначы вецер палярны і быстры
топіць ў сьцюдзёнай
імгле Пецярбург...
Пэўна, над Нёмнам, разносіць ён іскры
стрэх саламяных крыльлямі бур;
пэўна па млечнай і зорнай руні,
заслухаўшыся ў рэк сібірскіх гул,
з люлькай пагасшай вольны Бакунін
путы сарваўшы ідзе праз тайгу...
А там, дзе сьцеп з морам цалуецца сінім
і скіфскіх курганаў вяршыны гарэць, —
калыша кавыль ў сьцяпох Украіны
прызыўны напеў Свайго Кабзара...
Ну што-ж,—не глядзець-жа ў даль родную
[з сумам!..
Каб мог стаць на хмараў сінеючы плыт, —
пад парусам ветру паўночнага з шумам
на хвалі-б расьцьвіўшага лёну паплыў...

2

Ноч у абозе

Гараць агні абозныя.
Дождж... Звоняць камары.
Пра слухі, весткі розныя
паўстанец гаварыў.
—Над сьцежкамі, над польнымі
ўстае дзень для сялян, —
казаў, што будзем вольнымі—
сам Сьвітка — Атаман...

Другі пад ёлкай стоючы,
пад дождж грыбны, густы,
пярэчыў яму горача
апёршыся на штык.
— Эх, штосьці мне ня верыцца

у байкі для малых:
мы б'емся за аселіцы,
за нейчыя валы.
Зямля,—дзе глянеш,—панская,
вада, лес і гара.
Прыелася мне ласка іх, —
як бацюшкі цара.
Ўсе сталі раптам „мілыя“,
але зарчэй глядзі,
каб нас пад плечы віламі
хто з іх не падсадзіў.

А трэці, шрот сартуючы,
пытаў раз можа сто:
— Але, скажы, гаруючы
змагаемся за што?
Вось маю раны хворыя,
чаго пайду дамоў?
ці перамогшы ворага
зноў легчы у ярмо?

Хтось галасы трывожныя
прыйшоўшы абарваў.
Ў зары агнёў разложаных
сам Атаман стаяў.
— Пільнуйце коняў, коньніца,
падсыпце ім аброк,
глядзеце ў парахоўніцах
набой каб не замок!

Пайшоў... А іскры золата
з агню ляцелі ўвысь.
Зноў гаварыў хтось шопатам,
як шолахам травы:
— Паны сягоньня водзяцца
з царом за бараду,
дасьць костку ім—пагодзяцца,
сялян запрададуць...
Каб Атамана нашага
ня даць у рукі ім...

Зноў шопат змоўк, як згашаны,
разьвеіўся, як дым,
дождж акалотам — коласам
шумеў ў глухім бары
і хтось знаёмым голасам
пра порах гаварыў.

3

Пра Сьвітку першы раз чую

…„Шесть раз его поцѣлавал—и каков—
ни слова мнѣ не сказал"!..
Мосолов „Русская Старина" 1883.

Палкоўнік Лосеў

Сядайце!
Так... Я ня мог вас паклікаць раней.
Гэты мяцеж, безталковы мяцеж!
Шмат невінаватых людзей
часам змушана скутых сядзець,
пакуль разбяромся...
Як вас зваць?

Арыштаваны

Паўстанец... Пад Няміравам ўзяты...

Палкоўнік Лосеў

Шляхціц?

Арыштаваны

Не!..

Палкоўнік Лосеў

Ўсё-ж хацеў-бы я знаць,
хто вы? скуль? дзе сям'я ваша, хата?
хто ўцягнуў вас, за кім вы пайшлі ў гэты бунт?
колькі лічуць ў лясох вашы сілы?...
І... ўдалося-б ўцячы ад пятлі ці ад пут,
мо' дасталі-б на'т царскую міласьць ..
Хэ, брат, дома...
ляжыць...
сіратой паласа.
Мне шкада, чалавека, ей богу, як брата, —
можа плача хтось ў полі над жменяй аўса,
конь і той пэўна ржэ за аратым...

Арыштаваны

Кінь, пан, — ведаў, — ішоў я куды,
тапарышча падняўшы рукамі худымі.
Што казаць? Каб вы посьле малых і старых
маім катаржным мучылі імем?!
Людзі памяць у вёску і так занясуць,
мяне зьняўшы з высокай асіны.

Шкода, пан, што ў руках ня ўтрымаў я касу
і ў лясох у час бітвы ня згінуў.

Палкоўнік Лосеў

Ну і ёсьць-жа чаго шкадаваць!
Можа гэта ў раз тысячу лепей?
Мне, павер, за вас баліць галава,
што йдзіцё за панамі вы сьлепа.
Цар даў волю,
а яны хочаць зноў
і на вас, і на вашы загоны
налажыць, як на стада валоў,
ўвесь цяжар і нядолю прыгону.
Слухай!..
будзеш вольным у гэту ноч,
расталкуй толькі масе шэрай, —
ўбілі-б ў грудзі паўстаньня нож, —
бо табе яны будуць верыць...

Арыштаваны

Не, пан, сам я з касьці мужыка.
Хай ляціць навальніца па нівах!
Не падымецца гэта рука
бунт ўстрымаць за агністую грыву.
А што разам, — да часу ідзём
і ня верым паном і іх радам;
яны поўзаць гатовы ужо прад царом
і мо' заўтра яны нас здрадзяць.
Важна нам, пакуль з лесу ня выйшлі яны,
пакуль плечы прад вамі ня хіляць, —
за Дняпро
і за сінія хвалі Дзьвіны
перакінуць лапцюжныя сілы.

Палкоўнік Лосеў

Ці ня з Сьвіткі абозу ты будзеш такі?

Арыштаваны

Не, ня чуў я ніколі аб гэткім...

Палкоўнік Лосеў

Дзіўна! Песьні аб ім жабракі
разнясьлі па дарогах, палетках.
Мяцяжом яго імя гучыць.
Так... Час толькі над вамі марную,
а хацеў-бы душой памагчы...

Арыштаваны

Ўсё-ж... пра Сьвітку...
першы раз чую...

4

Сьнег на шыбеніцах і на твары

Першы мешчанін

Трэба лепш захінацца ў кажух.
Настаўляй, Клім Іваныч, каўнер!
Гэткі вецер! Табе я кажу:
паміраць не хацеў-бы цяпер.
І за гарнец гарэлкі ніхто-б
не пайшоў-бы нат' ямы капаць.
Бачыш: сьнег, быццам белы патоп
пачаў вуліцы хваляй змываць,
і нясе, і плыве, і вірыць
і чорт ведае дзе і куды;
быццам полымем неба гарыць,
студзень з люлькі пусьціў белы дым...

Другі мешчанін

Прашу, выбачце, вас, гаспадзін,
ці ня можна у вас аганьку?..
Вы на пляц ідзіцё так адзін?.. —
Клім Іваныч, а гэта мой кум.

Каліноўскі

Вельмі рад... Я Вітаўт Вітажэнц.
Думаў, сяньня вучыць не пайду.
Ды, прызнацца, хацеў паглядзець,
як на сьмерць гэта людзі ідуць.

Першы мешчанін

„Павучыцельна“, што і казаць.
Ўчора, — бачылі, — гналі ў Сібір,
або як ўскалыхнулі ксяндза?
Апісаць-бы мог толькі Шэкспір.
Мы вось так, Клім Іваныч і я,
ходзім разам заўсёды на пляц...

Каліноўскі

А мне школьная праца мая
не дае нават часу паспаць.
Каго-ж сяньня вядуць на парад?

Першы мешчанін

Чуў, здаецца студэнт з іх адзін,
пецярбурскі... так, нейкі Ігнат...
з Каліноўскім атрады вадзіў.
Вось ідуць... Барабанная „дроб“
зараз сыпне гарохам у сьнег...
Клім Іваныч, плячмі, праз народ! —
Ня відаць за галовамі мне.
Выбачайце! — ўступіў на нагу?..
Вось, ўжо бабам ня трэба глядзець.
Сьлёзы... Што-ж гэта я не магу
бачыць, дзе наш стаіць Вітажэнц?..

Каліноўскі

Вядуць... Нядаўна гутарыў з імі.
Апошнюю ноч сядзелі ў смалярні да дня, —
радзіліся, каб вясной зноў штыкамі стальнымі
над краем штандары паўстаньня падняць...

З натоўпу

— Пастаранецеся!
— Дайце глянуць!... Маладыя...
— а нябось пасівела, глядзі, галава.
— Эх, дурні, пацягнуў іх чорт нейкі за шыю, —
— захацелі з царом ваяваць.
— Цішэй там! Чытаюць...

Каліноўскі

Шукае вачыма знаёмых.
Бачу, брат, слаўна ідзеш!
Не зламалі цябе у засьценках сьцюдзёных,
не заліць ім ахвярнаю кроўю мяцеж...
Ды ідзеш не на сьмерць ты здаецца!
Даўно, помню, калісь ты так бодра хадзіў.
Пецярбург... Вечары...
а за пазухай Гэрцэн,
ў сэрцы „Колакала“ калыхаўся прызыў.
Пра Ўладзімерку песьню любіў ты
і Некрасава сумны напеў...
Прашумела жыцьцё прыдарожнай ракітай,
рана дзень твой зарой адзьвінеў...

З натоўпу

Вось паднялі...

Мешчанін

А мы вас шукалі...
Бачыце: вецер калыша,
                    тварам глядзяць на раку.
А можа з такой вышыні відаць ім зарэчныя далі.
Я перапрашаю, я зноў-бы у вас папрасіў аганьку.
Бачыце, сьвет ужо новы, іншыя людзі.
Што такім шыбеніца, катарга, сьмерць?..
Вось, ці на добрае толькі народ яны будзяць, —
як вы думаеце, гаспадзін Вітажэнц?..
А мяцель іх калыша...
                    абвіла іх тканінай сьцюдзёняй...
Вы йдзіцё?
А я пастаю, недалёка мне.
Ці ня плачыце вы?
Мо' хто родны, блізкі ці знаёмы?

Каліноўскі

Што вы?..
Гэта толькі на твары растаіў сьнег...

(Працяг будзе)

Студзень 1938 г.

М. ДАЛЬНЫ

Шопат зямлі

Верасьнёвае сонца счырванелым лістом прыліпла недзе да страхі. Яшчэ хвіліна — і яно абарвецца за поле, за вёску, у малінавы небасхіл. Хутка набяжыць змрок на зямлю, і серабыстыя зоры зайскрацца ярчэй. А неба, — як ліпавы цьвет.

Шалясьціць сена ў цяжка наладаваных вазох пераціветамі летніх днёў. Зачэпіцца фура дзе за галіну і абдае твар лёгкай поцярушшу.

— Но-о, Лыса!

Ідзем ля вазоў. Хяжкая дарога. Пясок сыплецца з колаў, як з млына.

— Э, ты — прыстала?!

— Ганяй, ганяй!

— Бічом!

Коні чыста ўпрэлі. А дарога ўплывае так паволі. Яшчэ далятаюць галасы вёскі — вячэрні крык дзяцей, брэх сабак. Капальніцы вяртаюцца з поля. Іх постаці плаўна пасоўваюцца ў захад сонца. Капачкі як-бы дакранаюцца да хутка згараючага неба. І ёсьць нешта павабна прыгожае ў чалавеку, які ідзе на мяжы неба й зямлі. А гэты чалавек мо' думае аб вячэры ці сваім заработку. Дыхаецца так свабодна. У халадзеючым паветры—віно восені. Вечар мяккімі робіць галасы.

— Мае колы пачынаюць загаварываць. —

Праклінаем дарогу. Але не'к прыемна, лёгка. І аб чымсь няведамым расказвае скрып вазоў і йзноў новым, нябачаным здаецца гэты рознакалёрны вечар. Вазы трывожаць цішу апусьцелых палёў. Скрыпяць вазы, нібы травы й каласы нашумелі ў іх свае ясныя звоны. Жніва шэлестаў і напеваў!

Пясок скончыўся. Уяжджаем у лес. Байчэй ідуць калёсы, пераскакваючы праз аголенае карэньне, чапляючыся за галіны елак. Едзем доўга моўчкі. Мо' лес так ціхамірным шопатам навеяў нам гэтае маўчаньне й задуму. Быццам сьпяць думкі.

А мяне-ж нядаўна звольнілі з школы. Усе дні раптам страцілі сваю гатунковую вагу, раскідаліся ўсе пляны. А чамусьці спакойныя я, ціхі, як гэты вечар... Лес у імгле — як казка: пахне прыемна сырасьцю, і смалою, і мёдам. Дрэвы пачынаюць свой лёгкі, ясны сон. Мякка ісьці. І здаецца бачу — кляса. — У вакно чапляецца серабрыстае павучыньне — кожны ўкрадкам пазірае на гэтыя антэны, што калышацца мерна й плывуць у сонцы.

> ...Хай іншы жаліцца старонцы,
> Я-ж сьлёзаў ня лію, як вы!..

Голас яе такі малады, як-бы яна прыйшла вось толькі што з зарошаных палёў. І ўся яна — моладасьць.

> ...Я-ж сьлёзаў ня лію, як вы...

А недзе ў ложачку ляжыць мая хворая дачанька. Коцяваркоця. Галоўка яе схілілася, як у птушачкі. Вочкі мутненькія. Вось за вакном серабрыцца дужкамі павучыньне. Сумна неяк. Можа таму, што адцьвітае мая моладасьць, а можа пануры, пахмурны дактыль кажа аб адцьвіўшых летніх днёх. —

Шалясьціць сена. Скрып — скрып — адзываюцца вазы. Цёмнай заслонай ахінаецца глыб лесу. І наплываюць далей у няіснуючай пэрспэктыве ўспаміны, яшчэ абвеяныя сьвежасьцю дзён:

— Паперка такая, надрукаваная нейкай машыністкай. Машыністка можа ела яблычка або шмінкавалася. І ў паперцы сухія формулкі, як у старых дакумэнтах і такое згубленае ў слоўніку між тысячаў іншых словаў: звальняю. — Чаму? За што? Ці-ж я здэфраўдаваны сэквэстратар, ці сьпіўшыся чыноўнік?

—Вясна. Зацьвітае зямля. У сонцы блішчаць лужыны ўдзень. І публіка вясёлая, разьсьмеяная. Прадвесьне дыхнула на места. І, здаецца, увесь сьвет такі цудоўны й дыхаючы, такі безгранічна прыгожы. Добра было-б пачытаць цяпер нешта... Я-ж так мала прачытаў. Экзамены, экзамены! І нашто яны? Каб пасьля надрывалася жыцьцё й нарастаў сум па страчаных, недацьвіўшых днёх. Я іду за плугам і конь ня слухаецца. Крывіць баразна, выскаквае плуг. І хочацца, здаецца, крыкнуць, абцёршы пот: Дзеці Беларусі! Дачка мая! Паслухайце...

— Мішка! Бяжы да каня! Заварачывай!

Я прачынаюся. Ужо шаша.

Замахорываем. Папраўляемся. Лезем на фуры й зарываемся ў сена. Хутчэй закруціліся колы, як-бы рады, што выехалі з панурага лесу. І прыйшлі іншыя думкі. Заход згас, толькі на небе далёка, далёка расплыўся ясны адсьвет агнёў Беластока.

— Што-ж, Максім, раскажы што-небудзь...

Максім паварачываецца да мяне й на яго загарэлым твары відаць заклапочаньне.

— Я ня маю чаго расказаць. Вы скажэце — вы унівэрсытэт скончылі.

Я? А вось, сапраўды, што-б я расказаў Максіму, такое цікавае, каб яму вочы ня клеіліся. Здаецца, так мала я ведаю. Калі былі Пуніцкія войны ці Француская Рэвалюцыя, законы, тэорыі... Максім ведае, як аблічыць век каровы, ведае гэнэалёгію суседзяў, гісторыю хат.

— Ну, няўжо ты нічога не раскажаш? — і нейкае няпрыемнае пачуцьцё халадзіць словы.

Максім лічыць патрэбным расказаць гісторыю свайго жыцьця. Зачэплівае лейцы за рубель і — прадамной рысуюцца знаёмыя абразы.

— Вайна. — Доўгая дарога, таварным цягнікам. — Незнаёмыя месты, людзі. — Насіў яйкі гатаваныя да цягнікоў на станцыю. — Жабраваў з маткай па расейскіх вёсках, у салдат кашу прасіў, папіросы прадаваў. Сам навучыўся курыць. А пасьля —

ізноў таварныя цягнікі, кашаль, духата, сьмерці, абеды ў лесе гатавалі, лыжкі з капсуляў ад бомбаў вылівалі, стаялі тыднямі то ў лесе, то ў полі эшалонам. Але ўсё бліжэй і бліжэй была родная зямля. А вярнуліся — бацька сварыўся за зямлю з братам. Калатня ўзьнялася. За грудзі хапаліся. Так і ўмёр стары. Сам ён, Максім, гаспадарыць узяўся. А гаспадарка — адны пусткі. У тартак кінуўся. Гатровым пару лет працаваў. Так-сяк каня купілі. А вось цяпер ужо жанаты ён. Дзяцей чацьвёра. І ў кожны рот — даць-жа трэба. Зямлі мала. Ледзь ліпіш. Грошы туга прыходзяцца. І жыць нудна. Жывеш, як скаціна тая. За працай і сьвету ня бачыш. Гарэш, сееш увесь век і ніскуль няма, каб хоць радасьць нейкая. І людзі ўсё такія — прыдзе вечар, наткнешся ў вёску, а там — гарэлка, карты, лаянка. Усяго таго й бачыш. А ў хаце — сварка, плач. Каб так зямлі трошкі...

Максім доўга маўчыць і маўчаньнем як-бы даканчывае свой расказ. Я ўсё разумею.

Коні машуць галовамі й нейкай многазначна-таёмнай робіцца дарога. Сюдыма можа калісь каралі праяжджалі, абозы купцоў ішлі, войскі перасоўваліся... Глухая ноч. Толькі над вастраколам лясоў усё ярчэй гарыць Беласток.

З узгорка ня можам стрымаць коняй. І трэба-ж было не ад'ехацца трохі.

— Не наяжджай! Трымай! Трымай!

— Едзь! Едзь! Бо наеду!

— Вывернеш! Стой!

— Хлопцы! Сюды!

Але мы — ня можам стрымацца. Зьехаўшы ўніз, зьбягаемся. Міхась стаіць спалоханы й дробна лаецца ў ноч.

— А, халера, ледзь у аткос ня ўехаў!

Каб трохі, кола зьляцела-б. Шрубка дзесь выпала. Можа дзе ў траву закацілася.—Цёмна. Палім траву і як з паходнямі ідзем уздоўж шашы. Загараюцца золатам камлі высокіх соснаў.

Шрубкі няма. Абшукваем траву аткосаў, грабем віламі, мацаем рукамі, поўзаем, спацелыя й задыханыя. Нічога! Зарыўшыся ў сена, чакаем расьсвету. А Міхал усё недзе лазае, усё шукае, як-бы бярэ ўсю віну на сябе.—Дрэмлем. Так прыемна. Не трасе жывата. Здаецца, кудысь плывеш, плывеш...

— Эх, чорт! Мелі быць рана ў Беластоку, а цяпер...

— Ай, заедзем яшчэ, заедзем!..

— Не пашэнціла, хлопцы!

— А ты сьпі — і ўсё!

Праз дрымоту чуецца тарахценьне вазоў. Мінаюць нас. Здаецца, ужо трохі сінее неба. Грукат расьце — быццам на вайну выбраліся вёскі абозам. Мутнымі абрыўкамі тчэцца трывожны сон:...

— З бежанства едзем. А Максім галоўку ад бомбы дзесь знайшоў у полі — вось капсулёк добры будзе. Максім — кры-

чу — цягнік рушыўся. Застанешся тут — і да хаты не дабярэшся. А Максім кажа ў адказ: мне і тут добра, а што там? на роднай зямлі, а? Пусткі адны. Цягнік усё шыбчэй, а мне шкада Максіма. Не, не пакіну яго тут на чужыне. — Стойце, крычу, чалавек астаўся. Але цягнік не становіцца. Саскакваю й бягу да Максіма. — Максім, Максім, Максім, што-ж ты ўздумаў? Ці-ж ты роднай зямлі ня любіш? Што пусткі — абы мы былі, — а сам цягну Максіма. І Максім ужо бярэцца бегчы, але ня дасьць рады. Я ўсё выбягаю наперад, яшчэ намагчы добра — дабяжым, але й Максіма кінуць не магу, бягу да яго, — хутчэй, крычу, махаю рукамі, то йзноў за цягнікам бягу. А задні вагон усё далей і далей — і раптам:

— Хлопцы! Шрубка! — Міхась задыханы бег па шашы і вымахваў нечым у руцэ.

— І хай-б падумаў! На самым разьезьдзе знайшоў!

Змагаюся з дрымотай. Дрыжыкі праходзяць па целе ад холаду. Едзем ізноў. Прад намі, за намі — вазы й вазы. Лілейкамі белымі ківаюцца на вазох жанкі ў хустках белых. То ня ймгла на дарозе, то пыл курыць. Едуць людзі, едуць у места тарговае, у Беласток. Дымяць смалякамі фабрычныя коміны. Лепяцца домікі — скрынкі ад сернічак. Вырэзваюць неба геомэтрычнымі фігурамі вуліцы.

— Каб добра сена прадаць...

Упарта таргуемся. Колькі панамахалі касой, колькі сонца панапякала. А гэты чалавечак, што плюецца скарагаворкай і сьмяецца з нашае працы, можа й касы ў руках ніколі ня трымаў.

— Пяцёрку хочаш?

— Правалівай, правалівай! Няма чаго.

Але мы наіўныя. Рынак у руках гэтага заплёванага перакупшчыка й мы змушаны прадаць за бязцэн сена.

Крыўда і злосьць. Мо' голад робіць чалавека злосным і нядобрым. Мы-ж яшчэ й сухога ў роце ня мелі. І такімі ненавіснымі здаюцца гэтыя жаўнеры, што мыюцца на ўквечаным панадворку кашараў. Пацеем, скідаючы сена ў нейкія склады. А яны глядзяць на нас, выпучваюць свае мускулы.

— Ну, добра, другі раз не ашукаемся...

Хтось на нас добра зарабіў. А на другі год мы таксама халодным ранкам сьмелымі ўдарамі ссыплем расу з сьвежых траваў...

— Хутчэй!

Сьпяшаем: і коні, і мы.

— Чаго стаіш, разява? На бок! Аглобля ў рот уедзе! Людзі аглядаюцца на нас. — Мужыкі п'яныя паехалі... Мы горш, як п'яныя — мы змучаныя, вычэрпаныя, нявыспаныя, галодныя. А людзі паволі ідуць, не сьпяшаюцца. Так мне здаецца, бо я галодны й злосны.

— Мужыкі п'яныя паехалі...

І ніхто ня ведае, што я чытаў Сафокла, Гейнэ, Есеніна.

— Мрр...

Брудны рэстаранчык на „Пясках". Няпрыветна глядзяць пакрыўленыя ад гарэлкі твары сялян. Трохі сьвету ліецца праз счарнелыя шыбы, і каб убачыць нашыя хурманкі на пастоі, трэба працерці брудны пот, абсеўшы, як мароз, на вокны. Пахне гарэлкай, потам, селядцом. Нудна неяк, несымпатычна. Можа таму, што мы цэлыя суткі няеўшы. Не сядаем, а валімся ў кутку на лаву. Ногі адразу наліваюцца ўтомай, ня хочацца нават гаварыць.

Таўстая шынкарка хітрымі вачыма аглядае й ацэньвае кожнага з нас папарадку й, разстаўляючы шклянкі, пытае:

— Колькі даць? — бутэльку?

Шклянкі брудныя, спырсканыя для віду вадой. Лаемся на шынкарку, але яна, няўзрушаная, суне шклянку прад вочы Міхасю.

— Ну, гэта брудная?

— Я не сьляпы! Бачу! — адгрызаецца Міхась.

— Пастаўце, пастаўце, а то зараз яе палажу.

— Які ён сярдзіты, — сьмяецца шынкарка.

— Бо й сярдзіты. —

Ах, прыемна было-б ухапіць кавалак каўбасы й пхаць яе ў рот так бяз сораму, з шкуркай, закусваючы хлебам. Але мы выходзім.

Шукаем другой кнайпы. Валочым ацяжэўшыя ногі і — ўрэшце — сядзім у даволі чыстым пакоі. Прад намі „службовыя" з шкляначак ад муштарды, адзін нож да агульнага ўжытку і пара пакрыўленых відэльцаў. О, чыстыя талеркі! Беласьнежныя абрусы! Ёсьць фабрыкі, дзе яны вырабляюцца. А Валодзя, хлопчык вясковы, есьць кашу лыжкай, упэцканай у пясок, дзе можа хтось пляваў...

— Службовы?

— Ну, валяй!

Адразу п'янеем. Змучаныя, утомленыя, сядзім і слухаем, як у бакоўцы іграе хтось на гармоніку й фальшывіць сьпітым голасам „Дубінушку".

— Добра іграе! — Хлопцы любяць музыку.

А ў гэтую хвіліну існуюць недзе людзі, якія слухаюць сымфонічныя канцэрты, пералівныя галасы сьпявачак...

— Ну, пі — ня крывіся!

— Ня прыслухоўвайся!

— Гэта апошняя!

— Дай Божа, на Пасху ў вялікіх местах...

Мы зусім папіліся. Ня памятую, як з намі сеў той сьпявак. Сьмяюся:

— Вам-бы дубінушкай па сьпіне.

Ня мае нічога проціў і шопатам выясьняе: — ён быў шофэрам, а цяпер зарабляе сьпевам.

— Як там коні?

У вачох, як праз прызму, — буфэт, а за ім, як мэбэль, нярухомы й спакойны гаспадар. Нейкая сухотная паненка круціцца каля нас. Але мы... не! Яна відавочна злуе й нэрвуецца.

Выходзім і ўжо паволі брыдзем па крывых вулачках. Усё нас цяпер цікавіць. Заглядаем у вокны магазынаў. Дзівімся, што ў спажывецкай краме няма чэрні да вечных пёраў. Спрачаемся за два грошы рэшты.

Мне хочацца яшчэ пабачыцца з сябрам.

— Гэта-ж надта далёка!

Наймаем вазьніка. Не шкада залатоўкі. Так даўно ня бачыўся. Яшчэ студэнтамі ў Вільні. Зьбіраліся ў мастака Верамея, закурывалі яго пакойчык, хацелі зрабіць пераварот у беларускай літаратуры. Так нічога й ня выйшла. А хто ведае?

Едзем доўга аднэй вуліцай. Фабрычныя кварталы. Пачарнелыя коміны і доўгія платы — агарожы, вугаль, дровы, дым. Сумная абстаноўка. Побач туляцца маленькія да сьмеху домікі, баракі... Нечыя рукі засадзілі тут кусьцікі бэзу, язьміну. Бязьлюдна! На лавачцы нудзіцца беластоцкі пралетары з зламанай рукой — рука падвязана нязручна высока — ледзь не да самай шыі. Вочы яго, вялікія, чорныя, доўга праводзяць нас.

— Дык вось, брат, як ты жывеш.

У маленькім пакойчыку мы ледзь уселіся. У суседнім удвая большым пакоі — кухні — месьціцца ўся сям'я — бацькі, брат, сястра. Нейкі жаночы голас крычаў, як саксафон, а ў адказ яму гучэў захрыплы хранічна бас.

І мы гаварылі... Доўга, пакуль ня прыйшоў вечар.

— Ты разумееш, хочацца напісаць так, каб нават у такога паршывенькага, дробненькага чалавечка закалупаць трохі душы. Але гэта ня так проста...

— Вось накіды — жывыя нябожчыкі.

На стале ляжалі нядбала раскіданыя паперы.

— Працуеш і ўсё думаеш: ну, скончу працу, а праца толькі для заработку, і тады буду пісаць, пісаць... Але недаспаныя ночы робяць сваё — думкі слабыя, галава адмаўляецца працаваць.

— А ў нас павінен цяпер зьявіцца вялікі пісьменьнік, вялікі, з усясьветнай славай.

— Часам находзіць нуда й жыць ня хочацца. І думаеш так сабе — і на якога чорта я мушу пісаць, мучыцца, недасыпаць, нішчыць свой арганізм. Але гэта...

— Гэта цяпер для нас — опіум, які атручвае...

— — — — — — — — — — — — — — — —

— А мяне вось звольнілі.

Ня зьдзівіўся нават. Як-бы гэта было зусім зразумелым і звычайным.

Беласток мігцеў вагнямі, калі мы выяжджалі. Нясьліся вуліцы. Недзе ў бязьмежную вясковую даль спадалі электрычныя агні. Моцна трымаемся за лавэты. Можна выпасьці, а мы п'яныя. Дошкі ўядаюцца ў бакі, муляюць косьці. Сады й домікі, апаясаныя тратуарамі. Па бруку трасе, воз бражджыць і звоніць. Хвалі каменьняў. Як-бы каменьні сабраліся ўцякаць з места, а воз імчыць па іх хрыбтох, расьпіхае цагляныя дамы. Воз неміласэрна танцуе па бруку. Здаецца, сам едзеш запрэжаны й малоціш каменьне. Прыемны вячэрні гоман вуліц. На тратуарах так зразумела паволі сунуцца пад рукі парачкі, пахне верасьнёвымі лісьцямі.

На прадмесьці ўяжджаем у мрок. Рэдкія аганькі, а далей мора цемры. І там недзе нашыя хаты й чакаюць нас. Апошні аганёк — і места нікне, прад намі шаша сьветлай істужкай плыве ў лясы, балоты. Міхась ляжыць упоперак лавэтаў, лейцы зачапіліся за нагу, галава зьвесілася ўніз і з-пад шапкі выбіўся пух сьветлых валасоў.

— Ты — халера! Ты-ж жонку маеш, дзіця. Што-ж ты робіш? Трасу Міхася, але ён, відаць, не разумее.

— Ты чуеш? Ты-ж жонку маеш! А цябе аўтабус разьедзе!

— Мне... брацішка.. усё роўна. Пусьцеце, хлопцы!

Холадна й дрымотна. Гаворым нешта. Закурываем паламаныя папяросы. Сілімся ня спаць. Уважаем на Міхася. Але трудна змагчы сон. Усё здаецца такім непатрэбным, і гэтая дарога, і сена, і грошы. А ў хаце чакаюць, ня сьпяць.

Чапляюся мацней нагамі за лавэты, рукамі абыймаюся з Максімам, і так едзем.

Робіцца прыемна — прыемна — усё глушэй дзурчыць жорсткі пясок пад коламі...

І шэпча мне зямля: дзеці мае! дзеці — бо я вас радзіла. Я ўсё вам дала, што мела, я вас карміла сваімі грудзьмі, я вам складала чароўныя казкі. І сінія зоркі і белы месяц заглядалі ў маю калыску. Я цешылася. Вы вырасьлі і забыліся, што вы ўсе дзеці мае. Вам стала цесна і вы пачалі забіваць адзін другога, вырываць кавалак хлеба з чужога рота, як дзікія зьвяры. Вы пабудавалі вялікія месты і дамы ў іх, але й там вам дрэнна. Вы нарабілі межаў і загарадак і брат не дазваляе нават зірнуць другому, што ў яго робіцца.

І ў шопаце зямлі чуецца мне ціхі плач.

— Вам цесна, вам душна, а гляньце — колькі сонца й прывольля ў маіх прасторах. Вы бедныя, а колькі багацьця раскі-

нула я вакол вас. Што больш я магла вам даць? Няма хіба ў сусьвеце істот шчасьлівейшых ад вас.

І ў нас сьлёзы — і ў Максіма, і Міхася, і ў мяне з сябрам— і мы быццам кажам:


— Гэта — ня мы! Гэта — ня мы! Мы верныя дзеці твае. Можа мы — можа мы адарваліся ад твайго ўлоньня й пайшлі ў душныя гарады, але ці мы вінаваты, што твой небасхіл ня мае канца. А глянь — і гэты Максім, у якога зацьвярдзелі на ўсё жыцьцё мазалі — і ён нездаволены.

І плакала зямля, ня сунімаючыся. І неяк нам было прыкра і больна. Глядзелі на нас месяц і зоркі й як-бы сьмяяліся.

Двацаты кілямэтр. Няўжо мы спалі ўсю дарогу й міма нас імчалі самаходы... Мы адны, а хлопцы можа дзе ў аткосе сьпяць, ці павыпадалі. Абапал шашы разгортваецца зямля, як-бы прыймае нас у свае абняцьці й расчыняе прад намі сваю глыб. Ціхамірна на душы. Ціхамірна, як-бы пасеяна там нейкая праўда. Спаць ужо ня хочацца. Раніца раскінула ружовыя платы на небасхіле. Патыхае сьвежы вецер і нікне туман. Усё далей і далей уяжджаем у родную даль.

Вось ужо відаць наша вёска. Стырчаць настрэшнікі ў сінявае неба, як рагі, быццам стада кароў лягло на выгане. Ужо чуваць, як недзе малоцяць.

Удары цапоў то глухія, то звонкія.



Успакаеньне буры

П. Сяргеевіч

МІХАСЬ МАШАРА

* * *

Люблю цябе ў цішы сумуючае поле. —
Зямля абнятая васеньняю смугой.
Пяю табе душой зьняможанай ад болю
пра смуткі ціхія —
спакой.

Вісіць туман сівой заслонай над балотам,
прыблудай нейкай бродзіць вецер па кустох
і пахніш ты уся —
мужыцкім горкім потам,
чырвоным золатам —
гарыш у валасох.

Лісьце асыпалась на межы і узьмежкі,
стаіць бяз шолаху іржавая трава,
аб раньню сонечным задумаліся сьцежкі
і хата кожная, —
як мокрая сава.

Бяз раньня дзень ўстае...
старым ад нараджэньня
і гасьне ў туманох —
бяз сонца на ральлі,
і толькі ў снох тваіх —
надзею прабуджэньня,
як радасьць ціхую, —
калышуць карані.

Восень, 1937 г. Таболы.

* * *

Зімовы лес...
спакойна - хмуры,
стаіць у сьнежнай цішыне, —
як-бы няма на сьвеце буры,
як-бы жыцьця няма у сьне.

Як ў байцы нейкай —
дрэмлюць сьцежкі
у белым кужалю гальля,
як-бы аднэй жывой усьмешкі
ня мае сонная зямля.

І пэўна сьніцца соснам гонкім
пявучы шопат лясуна, —
як-бы ня будзе вецер звонкім,
як-бы ня прыдзе зноў вясна.

* * *

Такой вось ноччу — пышна-белай
ніяк заснуць я не магу. —
Ля плоту цень абняўшы шэры
танцуе месяц на сьнягу.

Пад белым пухам лебядзіным
заснула вёска —
сном - нямым.
І думы ткуцца павучынай
і сэрца хочыць быць жывым.

У белым вэлюне асіны
купае месяц повад свой
і няжывы, сьцюдзёны іней
цьвіціць чаромхавай красой.

А ноч бяз шолахаў таёмных
над млечнай бельлю родных ніў
плыве у даль, —
як лебедзь сонны,
як песьні ціхай пераліў.

І пэўна сяньня сон ня змусіць
схіліць ў зьнямозе галаву,—
па сьцежках соннай Беларусі
з табой я ночка паплыву.

17.I.1938

АНАТОЛЬ ІВЭРС

* * *

Я шукаў яшчэ вясною
песьняў звонкіх на палёх.
Ды задумаю лясною
заківала мне гальлё...
Што-ж, пайду, мо' там у лесе
сіні шолах абтрасу
і вязанку новых песень,
весялейшых прынясу.
Днём няма у лесе соваў,
пахаваліся, ці што?...
Ў перагудзе струн сасновых
ўвесь калышацца прастор.

ХВЕДАР ІЛЬЛЯШЭВІЧ

Столькі песьняў

Столькі песьняў сьпяялі паэты,
і паэмаў злажылі ўжо шмат, —
але доля Твая — недацьветы,
Беларусь дарагая мая!..
І ня енкі, стагнаньні у вершы
я нанова хачу ўзварушыць, —
я ня буду радніцца з памершым,
ды нек сумна ў так званай душы.
Мне й хацелася-б песьняй аб шчасьці
узбуяніць наш родны прастор —
ўчора хлопчык Валодзя прадчасна
ў душнай хаце сялянскай памёр.
Ў гэтых хатах, занесеных сьнегам,
вецер ноту камячыць адну —
у махорачны дым — з нейкім гневам—
словы цэдзяцца... ўсё пра вайну.
Ў цемру ночы агні гэтых сёлаў
замятуха вугольлем мяце... —
Так, цяпер, Беларусь, невясёла
для Тваіх бяспрытульных дзяцей.
Жыць агоркла ў чорным горы —
ў сьнежнай далі лічыць крыжы...
І ніяк з за палёў, загор'я
сіні золак не набяжыць.
Эх, калі паніхідай апошняй
адпяюць гэты час песьняры —
векавую пакінуўшы ношу,
рукі выцягнуць к сьветлай зары!..

АНАТОЛЬ ІВЭРС

* * *

Неяк раніцай гарачай,
разам з сонцам ў каласох
хустка — чейчая маячыць
на загоне між аўсоў...
І калышыць нібы мроя
і курыць дарожна пыл...
Кажды стане пад гарою
быццам лічачы снапы...

С. КАЛІНА

На парозе новае эпохі ў беларускай літаратуры

Сяньняшнія праявы ў беларускім літаратурным жыцьці шмат у чым прыпамінаюць той стан, які быў каля трыццаці год таму назад. Тады сярод нямногіх беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў сярэдняе якасьці, якіх творчасьць, хаця з многіх бакоў цікавая і вартасная, не магла яшчэ стварыць магутнага літаратурнага руху, паяўляюцца Купала і Колас і ў кароткім адносна часе надаюць нашай літаратуры моцны і трывалы быт. Кожны з іх прадстаўляў апрычоную і розную паэтыцкую індывідуальнасьць, але абодвы, дзякуючы вялікаму таленту, асягіваюць высокую ступень артыстычнага разьвіцьця; іхняя творчасьць, глыбокая паводле ідэйнага зьместу, высокая і рознаякая з гледзішча мастацкага, распачынае новую эпоху ў нашай літаратуры.

І паколькі ўся нашая літаратура XIX ст., ня выключаючы нават Марцінкевіча, Багушэвіча і іншых, прадстаўляла скарэй за ўсё яшчэ нясьмелыя і спорадычныя, адасобленыя ад сябе фрагмэнты, чымсьці сыстэматычнае разьвіцьцё, патолькі ўжо часы Купалы і Коласа можым назваць эпохай поўнага і ўсестароньняга яе адраджэньня, эпохай яе расьцьвету і замацаваньня ў сваіх асновах. З гэтага гледзішча Купала і Колас маюць у нашай літаратуры вельмі вялікае значэньне, як ейныя тварцы ў сьціслым значэньні гэтага слова. Вялікую памылку робяць некаторыя літаратурныя крытыкі, пераважна чужыя, якія стараюцца ўвесь працэс разьвіцьця нашай літаратуры прыроўніваць бяз ніякіх засьцярогаў да літаратуры польскай ці расейскай, робячы на гэтай падставе розныя вывады, ясна-ж несправядлівыя і некарысныя для нас. Трэба ведаць, што абедзьве гэтыя літаратуры разьвіваліся праз у весь час нармальна, не адчуваючы ніякіх вонкавых перашкодаў, дык і аснаўны характар іх будзе розны ад літаратурнага жыцьця нятолькі Беларусаў, але і ўсіх тых эўропэйскіх народаў, якія разам з намі знаходзіліся ў падобным палажэньні. Такім спосабам беларуская літаратура вымагае іншага да яе падходу. Крытык мусіць яе разглядаць і ацэніваць, бяручы пад увагу ўсе тыя спэцыфічныя абставіны, у якіх яна радзілася і разьвівалася, і ўсе тыя яе характэрныя асаблівасьці, узалежненыя ад гістарычных праяваў народнага жыцьця. Недацэніваньне і ігнараваньне гэтых крытэрыяў, канечных у дадзеным прыпадку, можа лёгка завесьці на бездарожжа, а нават да абсурдаў. Клясычны гэтага прыклад мы бачылі ў артыкуле Ю. Путрамэнта *), які разглядаючы творчасьць Танка, трэба пры-

*) „Mikrokosmos literacki" („Pion" з дня 15. IV. 1937).

знаць быстра і наагул правільна, закрануў мімаходам і беларускую нашаніўскую літаратуру. І вось хочучы яе мерыць паводле Міцкевіча і Пушкіна, ды бяручы пад увагу спазьненьне нашых нацыянальных паэтаў—творцоў новай беларускай літаратуры ў адносінах да такіх-жа ў Палякоў і Расейцаў, прыраўняў яе да таго стану разьвіцьця, у якім знаходзілася польская літаратура ў XVI в. і расейская ў часы Дзяржавіна.

Калі ўжо ня можна абыйсьціся без прыраўнаньняў, то мусім шукаць іх ня ў польскай ці ў расейскай літаратуры, а ў літаратурах тых народаў, перадусім славянскіх, якія, гэтак як і мы, перажывалі сваю няцыянальную і палітычную няволю, а разам з гэтым поўны ці частковы заняпад культурнага жыцьця. Такое прыраўнаньне ёсьць магчымым, а нават вельмі карысным, бо тут мы сустрэнімся з нязвычайна падобнымі праявамі і працэсамі, выкліканымі аднолькавым гістарычным палажэньнем. Праводзячы такую аналёгію, наш Купала і Колас займуць адно з найбольш пачэсных месцаў сярод найвыдатнейшых песьняроўадраджэнцаў у іншых славянскіх літаратурах, такіх, як Я. Коляр у Славакаў, Фр. Паляцкі — ў Чэхаў, П. Негош —у Сэрбаў. І. Мажураніч і П. Прэрадовіч — у Харватаў, Фр. Прэшэрн і Я. Стрытар—у Славенцаў, І. Базаў—у Баўгараў, ды напасьледак Т. Шэўчэнка —ў Украінцаў.

Праўда, з прычыны шмат горшых умоваў беларускага жыцьця, поўны расьцьвет нашае адраджэнскае літаратуры прыпадае толькі на пачатак бягучага стагодзьдзя, а Купала і Колас, у прыраўнаньні да ўспомненых чужых паэтаў, зьяўляюцца спозьненымі што найменш на паўсотні год. Нягледзячы на гэта, роля і значэньне іх ані трохі ня меншая нават з гледзішча агульнага, а ня толькі беларускага, бо, як Колас, так і Купала, паяўляючыся пазьней на літаратурнай ніве, былі ў сваей творчасьці больш новымі і дасканалымі; кладучы асновы для новай беларускай літаратуры і цярэбячы шляхі для яе, стараліся аднача сна ісьці з сучаснымі плынямі літаратурнага мастацтва.

Адраджэнская нашая літаратура, рэпрэзэнтаваная Купалам, Коласам і многімі іншымі, фактычна ўжо скончылася яшчэ пры жыцьці творцоў яе. Цікавае гэтае зьявішча магчымае толькі ў такіх літаратурах, як беларуская, якая, позна пакліканая да жыцьця, мусіла борзда прайсьці праз тыя мастацкія плыні і кірункі, якія ў іншых літаратурах разьвіваліся цэлымі эпохамі. І ўжо паваеннае літаратурнае пакаленьне, якое вырасла на творчасьці Купалы і Коласа, выяўляе ў многіх галінах зусім новыя асаблівасьці літаратурнага мастацтва, прадсказывае далейшыя зьмены і поступ у нашым літаратурным разьвіцьці.

Нягледзячы на пачатковыя пасьпехі, маладая гэнэрацыя, якая амаль выключна гуртавалася ў Менску, не змагла стварыць магутнага літаратурнага руху, бо быў ён, як ведама, прыпынены яшчэ ў раньнім расьцьвеце ў сувязі з першай хваляй перасьледаваньня бальшавікамі беларускай культуры ў 1929

і 1930 г. Такім спосабам паэзія ў Савецкай Беларусі не змагла належна разьвіцца, хаця творчасьць многіх маладых паэтаў, асабліва Я. Пушчы, У. Дубоўскі, М. Лужаніна і іншых была вельмі цікавая і прадсказывала буйныя і арыгінальныя таленты. Значна большыя рэзультаты асягнула там артыстычная проза, а повесьці і апавяданьні такіх аўтараў, як М. Зарэцкі, М. Лынькоў, С. Баранавых, П. Галавач і многіх іншых стаялі на адпаведнай вышыні і сьведчылі вымоўна, што й гэты род літаратурнага мастацтва пусьціў глыбокія карані. Тымчасам у мінулым годзе большасьць іх была абвешчаная „ворагамі народу", у выніку чаго спаткаў іх лёс падобны да іхніх папярэднікаў. Тыя-ж літаратурныя сілы, якія дасюль яшчэ ўсьцерагліся жорсткага перасьледаваньня, мусяць згодна з афіцыяльнай г. зв. „літаратурнай крытыкай" пісаць пераважна „агіткі".

І вось у часы розных неспадзяваных і няспрыяючых праяваў у нашым культурным жыцьці на прасторы ўсяе этнографічнае Беларусі, у часы розных літаратурных экспэрымэнтаў і хістаньняў, паяўляецца пясьняр з магутнай творчай індывідуальнасьцю і непрыкмячаным дасюль у нашай літаратуры талентам—Максім Танк. Ягоная творчасьць, што паўстала на працягу ўсяго трох апошніх гадоў, уліла ў нашую літаратуру зусім новыя плыні, выявіла аграмадныя мастацкія асягненьні, напасьледак намеціла новы, адказуючы духу часу і варункам сучаснага жыцьця мастацкі і ідэёвы кірунак. Беларуская літаратура дзякуючы Танку перажывае сяньня, пасьля „нашаніўскай" пары і ейнага прадаўжэньня, свой другі рэнэсанс, тым іншы за першы, што паколькі Купала і Колас, могучы мала карыстаць з літаратурнай спадчыны сваіх папярэднікаў, мусілі передусім тварыць і замацоўваць наш літаратурны быт, патолькі сяньня распачынае нашая літаратура эпоху поўнай дасканаласьці, асягіваючы агульнаэўропэйскую ступень разьвіцьця.

* * *

Спэцыфічнае палажэньне беларускага народу прычынілася да таго, што нашая літаратура не агранічаецца толькі да выяўленьня аб'ектыўных мастацкіх цэннасьцяў, але побач з гэтым зьяўляецца магутным аружжам у барацьбе за права народу да жыцьця. Гэтую асаблівасьць мы бачым у літаратурнай творчасьці ўсіх народаў, якія знаходзіліся ў падобным да нашага палажэньні, дык зусім натуральнай, а нават канечнай зьявай ёсьць гэта ў нас. Ходзіць толькі аб тое, каб утылітарызм літаратуры не разьмінаўся з яе мастацкімі вымаганьнямі, бо ў праціўным выпадку зьніжылася-б яна, як гэта бачым у Савецкай Беларусі, да ролі актуальнай публіцыстыкі і адыйшла-б далёка ад сваіх істотных заданьняў. Але гэтая небясьпека, зразумела не беручы пад увагу адносінаў у Савецкай Беларусі ды некаторых іншых спорадычных выпадкаў, наагул яшчэ нам не пагражала і не пагражае. Наадварот, нашая літаратурная твор-

часьць, будучая мастацкім выяўленьнем грамадзкіх імкненьняў народу і апотэозай ягонай барацьбы, набірала шмат творчае сілы і разгону, вызначалася глыбокай эмоцыянальнасьцю, зьмяшчала ў сабе многа ідэалізму і геройскіх матываў. Найлепшым гэтага доказам была ўся творчасьць Купалы, а сяньня зьяўляецца ім творчасьць Танка.

Такім спосабам Танк, нягледзячы на шырокія паэтыцкія заінтэрэсаваньні і ўзапраўднае багацьце тэматыкі, зьяўляецца ня толькі паэтам — мастаком, але ў роўнай меры і змагаром за народную долю. У сваіх вершах шырака ён закранае грамадзкае жыцьцё народу, пратэстуе супроць сацыяльнае несправядлівасьці, заклікае да барацьбы за лепшы лёс. Апрача лірычных вершаў многа Танк зьвяртае ўвагі на грамадзкія пытаньні і ў сваіх паэмах. Найшырэй-жа і найпаўней выразіў іх у „Нарачы". Апісывае тут змаганьне наднарачанскіх рыбакоў за права да вазёр. Але гэтае змаганьне, ахопліваючае і іншыя мамэнты сяньняшняга беларускага жыцьця, можна расшырыць на ўвесь наш народ. Такім спосабам праблемы, закранутыя ў „Нарачы", зьяўляюцца агульнабеларускімі, што бязумоўна робіць паэму больш цэннай з гледзішча яе ідэйнага зьместу.

Танкавая паэзія мае ў сабе вялікую сугэстыўную сілу, моцна прамаўляе да чытача, які яе нятолькі разумее, але і глыбока перажывае. Асягівае гэта пясьняр галоўным чынам дзякуючы глыбокай і шчырай пачуцьцёвасьці, якой зьяўляецца прасычаная ўся ягоная творчасьць. Тое, аб чым пяе паэт, на што жаліцца і да чаго заклікае, усё гэта магутнай хваляй выліваецца з яго душы, бо ўсё гэта ён перажывае асабіста. Пачуцьцёвасьць Танка, з якой выражае нятолькі ідэйны зьмест твору, але і ўсе іншыя закранутыя ў ім пытаньні, ёсьць беспасярэдняй і праўдзівай, далёкай ад штучнай і конвэнцыянальнай пачуцьцёвасьці, заімправізаванай усяго толькі для асягненьня эстэтычнага эфэкту. Пры гэтым варта зьвярнуць увагу, што і ўся беларуская літаратура наагул вызначаецца глыбокай эмоцыянальнасьцю, бо вырастае яна беспасярэдна з народных нетраў, выражае ў сабе, як было ўжо сказана, найбольш жыцьцёвыя імкненьні масы. Характэрна гэта асабліва для сучаснай нашай паэзіі, якая пазытыўна адрозьніваецца ад творчасьці многіх чужых паэтаў—прадстаўнікоў тых слаёў грамадзянства,якія ўжо перажыліся і ня маюць перад сабой вышэйшых жыцьцёвых мэтаў. Іхняя паэзія, бяручы наагул, гэта перадусім фармальныя экспэрымэнты, якім не адказываюць перажываньні аўтара. Паэзія такая—гэта рамясло, хоць часамі і нязвычайна містэрнае, але пазбаўленае душы, ня маючае творчага ўплыву на масы.

Эмоцыянальны падклад Танкавай паэзіі, як і ўсе іншыя ейныя элемэнты, зьяўляецца вельмі багаты і рознаякі. З аднаго боку мы знойдзем творы, як *Акт першы*, *Тры песьні*, некаторыя фрагмэнты *Нарачы* і інш., якія гучаць славамі моцнага пратэсту і бунтарнасьці; гэтым-жа прызывам адказваюць па-

чуцьці раптоўныя, імпульсыўныя, якія б'юць магутным прыбоем хваляў. У іншых-жа творах, якіх бадай што большасьць, пераважаюць пачуцьці спакойныя і зроўнаважаныя, хаця па сваей глыбіні і сугэстыўнасьці не слабейшыя за першыя. Цікавае насоўваецца з гэтага гледзішча прыраўнаньне Танка з Купалам. Хаця ідэйны зьмест у абодвых зьяўляецца галоўным матывам творчасьці, як адзін, так і другі стараюцца быць вучыцялямі і правадырамі масы, аднак паэтыцкае выражэньне гэтых матываў у кожнага іншае. Купала перадусім зачароўвае нас нязвычайнасьцю і магутнасьцю тону, голасам вешчым, пачуцьцямі сільнымі і глыбокімі; у ніводнага іншага нашага паэта не зарысавалася так выразна, як у Купалы, тая эстэтычная асаблівасьць, якую называем панямецку „Die Erhabenheit", папольску „wzniosłość" і г. д. Калі-ж ходзіць аб Танка, то ягоная пачуцьцёвасьць палоніць чытача не магутнасьцю і глыбінёй сваей, але беспасярэднасьцю і праўдзівасьцю, субтэльнасьцю і мяккасьцю тонаў, сваей складанасьцю і вялікім багацьцем адценьняў. З гэтага гледзішча многа розьніцца Танк ад Купалы, затое зьяўляецца блізкім да Коласа, якога пачуцьцёвасьць, нягледзячы на іншае артыстычнае выражэньне яе, наагул падобная да пачуцьцёвасьці Танка.

У мастацкім выражэньні ідэйнага зьместу сваіх твораў ня мае Танк сабе роўных сярод усіх беларускіх паэтаў, і то нягледзячы на тое, што, як было гаворана, утылітарны падклад нашай літаратуры вельмі рэдка шкодзіў і дэформаваў яе артыстычнае аблічча. Так напрыклад у прадстаўленьні паасобных эпізодаў барацьбы ў *„Нарачы"* паказаў аўтар няштодзенныя здольнасьці, галоўнае тое, што, разьвіваючы тую ці іншую ідэйную праблему, не разьмінаецца ён амаль ніколі з вымаганьнямі чыста мастацкімі. Ня могуць нарушыць гэтага прынцыпу вельмі рэдкія мамэнты даволі прымітыўныя, як напрыклад падчыркнутая Ад. Станкевічам *) агітацыя залажыць профсаюз, прадстаўленая ў паэме ў такі спосаб, што выглядае, быццам ад гэтага толькі залежыць вынік усей барацьбы. Поўнае падпарадкаваньне аўтарам праблемаў ідэолёгічных прынцыпам чыста мастацкім, — бо ў мастацтве, зразумела, найбольшую ролю павінна іграць мастацтва, — вельмі пазытыўна сьведчыць аб Танку, а ягоным творам надае непрамінаючую вартасьць **). Ня ў прыклад амаль

---

*) „У аспэкце соцыяльнай справядлівасьці" („Калосьсе". 1937 г. IV бач. 203).

**) Дзеля таго, што сярод нашага грамадзянства бываюць у гэтай галіне розныя непаразуменьні, якое часта любіць інтэрпрэтаваць літаратурны твор у спосаб зусім нелітаратурны, пазволю сабе на шырэйшыя выясьненьні. Ходзіць аб тое, што ў літаратурным творы, які ёсьць перадусім творам мастацкім, а ня нейкім іншым, можна, а нават трэба закранаць розныя грамадзкія праблемы, пры помачы якіх аўтар стараецца рабіць уплыў на грамадзянства, але гэтыя праблемы мусяць быць выражаныя памастацку, з гледзішча на артыстычную цэласьць твору. Інакш кажучы, грамадзкія праблемы ў творы, апрача сваей функцыі соцыёлёгічнай, мусяць мець пе-

усім сваім папярэднікам, пясьняр наш, выражаючы свае ідэі і грамадзкія пачуцьці, рэдка паслугоўваецца дэклямацыйнасьцю і фразэолёгіяй, неабапёртай на канкрэтным зьмесьце. Грамадзкія матывы ў Танка выплываюць арганічна із абразоў і сытуацыяў, намаляваных у творы, рэалізуюцца пры помачы канкрэтных і арыгінальных сымболяў. Як прыклад гэтае мэтоды можа служыць хоць-бы эпізод з пачатку V часткі „Нарачы", калі ўзбунтаванае сяло выплывае на возера — на палоў. Аўтар выразна падчырківае глыбокі ідэйны характар гэтага мамэнту, але, высьцерагаючыся конвэнцыянальных прызываў і заклікаў, з чаго скарыстаў-бы не адзін з ранейшых нашых паэтаў, выражае яго пры помачы наступнага абраза:

З Нарачы выплыла сонца;
шэрыя лодкі на сонца плылі;
біліся хвалі аб вёслы
і пераліўна і шумна цьвілі.

Сонца, якое выплыла з Нарачы якраз у гэты мамэнт і на якое плылі лодкі, мае тут бязумоўна шырэйшае, чымсьці дэкоратыўнае значэньне. Альбо якое-ж магутнае ўражаньне робіць на нас заканчэньне паэмы, калі рыбакі, перамогшы ў змаганьні, выплываюць на возера. Іхнія лодкі

Плывуць, разыходзяцца шырай...
хай вецер сьмяецца і звоніць
медзьдзю *шарахавак*, звоніць на вёслах, як гром!
Мы вылавім сонца
ў паднебных прасторах
і ў тонях!
Топяцца сеткі
ў жывое
азёр
серабро.

Пры помачы адно толькі адпаведна намаляванага абраза і глыбокага й прыгожага сымболю („Мы вылавім сонца ў паднебных прасторах і ў тонях") аўтар вельмі эфэктоўна выражае вялікую ідэю перамогі і свой оптымізм у далейшы вынік барацьбы.

Паколькі ў мастацкім выражэньні ідэйнага зьместу ня мае Танк сабе роўных ува ўсей нашай літаратуры і ў многіх галінах перавышшае нават Купалу, патолькі аднак не дараўновае

радусім функцыі чыста артыстычныя, як адныя із арганічных мастацкіх элемэнтаў твору. Выражаная такім спосабам грамадзкая думка, апрача сваей вартасьці артыстычнай, будзе мець бязумоўна і соцыёлёгічнае значэньне куды большае, бо патрапіць глыбей закрануць чытача і прамовіць ня толькі да яго інтэлекту, але і пачуцьцёвасьці. І наадварот, грамадзкія матывы із выразнай шкодай для артыстычнай вартасьці твору, г. зн. уводжаныя ў прымітыўны і вульгарны спосаб, нятолькі бязлітасна мсьцяцца над мастацкасьцю твору, але ў роўнай меры маюць вельмі малую, усяго толькі публіцыстычную грамадзкую вартасьць самую ў сабе, якая бязьсьледна праміна, як тольлі дадзеная праблема перастане быць актуальнай. Дзеля гэтага крытэрыюмам ацэны мастацкага твору не павінна быць толькі тое, што ў ім аўтар выразіў, але перадусім тое, як гэта ён выразіў, у які спосаб апрацаваў паказаную ў творы праблему.

апошняму з гледзішча багацьця і глыбіні грамадзкага зьместу. Купала ахопліваў у сваей творчасьці найшырэйшыя імкненьні народу, глыбака закранаў усе пастуляты нашага адраджэньня, быў найпаўнейшым і найбольш глыбокім яго ідэолёгам, пры гэтым не агранічываўся да праблемаў актуальных, сучасных, але так-жа сьмела сягаў у будучыню. У гэтай галіне Танк зьяўляецца крыху аднастароньнім і вузкім, агранічываючыся амаль выключна да праблемаў соцыяльнага характару. Праўда, у вапошнім часе пачаў Танк часьцей зьвяртаць увагу і на нацыянальныя пытаньні, але пераважна агранічаецца да канстатаваньня ўсяго толькі паасобных фактаў, найбольш яркіх і балючых у сучасным нашым жыцьці, як напр. адсутнасьць роднае школы і г. д., рэзыгнуючы з поўнага і ўсебаковага ахапленьня ўсіх нацыянальных патрэбаў народу. Трэба аднак верыць, што Танк яшчэ направіць сваю памылку, бо ўсе іншыя задаткі ягонае творчасьці прэдэстынуюць яго на агульнабеларускага народнага песьняра, які змог-бы быць у гэтай галіне годным наступнікам Купалы.

Паводле характару сваей творчасьці зьяўляецца Танк перадусім лірыкам, прынамсі такім сабе паказаў дагэтуль. Нават і ягоныя эпічныя творы, як „Нарач" і іншыя паэмы, зьяўляюцца перасычаныя лірызмам, у якім тоне і часта губляецца іх эпічная канва. Незалежна ад тэматычнай размавітасьці і багацьця лірычных вершаў Танка, — бо ў іх мы знойдзем і асабістыя пераҗываньні і настроі паэта, захапленьні хараством прыроды, розныя жыцьцёвыя праблемы, ды напасьледак грамадзкія матывы, аб якіх была ўжо мова, — усе яны вызначаюцца вялікай канкрэтнасьцю, якая асабліва дадатна зарысоўваецца на фоне яшчэ нідаўнай, а часткава нават і сяньняшняй лірычнай нашай творчасьці, пераладаванай абстракцыйнасьцю і патэтычнай фразэолёгіяй. Кожная канцэпцыя, кожная думка ў Танкавым вершы, а ня толькі зьмест цэлага твору, выражаецца пры помачы канкрэтнага і амаль заўсёды новага і арыгінальнага сымболю, кожны амаль верш Танка — гэта як-бы эпіцкая паэмка ў мініятуры, якая мае свой канкрэтны зьмест, сваю як-бы фабулу. Прыкладам гэтага можа служыць адзін з найкарацейшых вершаў з „Журавінавага цьвету" п. н. *„Зялёная радасьць"*:

Капае сокам зялёная радасьць
з месяца ціха на сьвежыя грады.

Ў садзе зялёным хтось позна гаворыць
голасам ветру і шопатам зораў.

Людзі варожаць, хтось ходзе на гульні.
Вусны, эх вусны, як п'яны багуньнік.

Як не хадзіць там, калі ноч такая:
сэрца, і вочы, і мак расьцьвітае.

Прыклад вельмі вымоўны. У першых двух радкох маем фрагмэнтарычны і міньятурны, але сакавіты і пукаты абраз зелені ў гародзе, калі сярэбраны блеск месяца разьлівае сьвежасьць, напаўняе радасьцю. Далей (два наступныя радкі) чуем у зялё-

ным садзе людзкія галасы, падобныя да голасу ветру і шопату зораў. Яшчэ далей больш даведваемся аб тым, што дзеіцца ў садзе, бо „людзі варожаць“, што „хтось ходзе на гульні“, а гэтыя „гульні“—нішто іншае, як любоўныя спатканьні, аб чым гаворыць шосты радок верша. Напасьледак аўтар дае паэтыцкае апраўданьне таго, што дзеіцца ў садзе, калі пад уплывам сьвежасьці і чару месячнае ночы — „сэрца, і вусны, і мак расьцьвітае“.

Такім спосабам збудаваны верш,— у якім кожны сказ гаворыць аб нечым іншым і новым, а выражаныя канкрэтна думкі і сытуацыі зарысоўваюцца адно толькі фрагмэнтарычна, агульнымі рысамі, паміж якімі заходзяць часамі нават вельмі далёкія і нявыразныя на першы пагляд асоцыяцыі і толькі фантазія чытача іх мусіць дапаўняць і вязаць у вадну прычыновую цэласьць,—бязумоўна выклікае няштодзеннае ўражаньне, глыбока і трывала ўдзяляецца чытачу. Падобную-ж аналізу можна правесьці і над кожным вершам Танка і ўсюды дойдзем да падобных ня менш цікавых рэзультатаў.

У сувязі з гэтым і сама структура Танкавых вершаў—прычыновае павязаньне паасобных элемэнтаў зьместу і яго разьвіцьцё — зьяўляецца заўсёды лёгічна абдуманай і аблічанай на паэтыцкі эфэкт. Налепш можна аб гэтым пераканацца, калі ўзяць пад увагу вершы многіх іншых нашых паэтаў, у каторых свабодна можна перастаўляць, а нават выкідаць і ўстаўляць цэлыя строфкі, што часта і робіцца пры выдаваньні іхніх зборнікаў, ад чаго ані чуць не зьмяняецца сэнс твору. У Танка было-б гэта недапушчальным, бо кожны радок, кожнае слова нават, а нятолькі строфка, мае ў ягоным вершы, як мы ўжо бачылі на прыкладзе „Зялёнае радасьці“, сваё адпаведнае месца ў творы і ў залежнасьці ад гэтага выконывае тую ці іншую артыстычную функцыю. Такая лёгічнасьць і зьлітнасьць у будове верша і вялікая функцыянальнасьць яго структуральных элемэнтаў зьяўляецца ў Танка нязвычайна характэрнай і цэннай, тымбольш, што спасярод сучасных беларускіх паэтаў толькі нямногія могуць гэтым пахваліцца і ў значна меншай ступені, спасярод-жа паэтаў ранейшых фактычна толькі М. Багдановіч часткова быў у гэтай галіне папярэднікам Танка.

З мэтаю заілюстраваньня гэтае асаблівасьці, вернемся ўзноў да зацытаванага верша. Ня трэба доўга задзержывацца, каб заценіць, што два першыя радкі і два апошнія твораць як-бы раму для цэлага твору з тым толькі, што ўсе гэтыя часткі лёгічна і псыхолёгічна з сабой вяжацца. Іменна пачатковыя і апошнія радкі прадстаўляюць абраз прыроды, настраёвы фон, на якім разыгрываецца акцыя, выражаная ў сярэдняй частцы верша. Пры гэтым тое, аб чым гаворыцца ў сярэдніх радкох, зьяўляецца ў прычыновай сувязі із зьместам пачатковых радкоў, а два апошнія радкі — ёсьць як-бы рэзультатам таго, аб чым гаварылася ў цэлым вершы. Падобная канструкцыя верша зьяў-

ляецца ў Танка вельмі характэрнай. Пры гэтым паэт вельмі часта любіць замыкаць верш тэй самай строфкай, паўторанай ідэнтычна ці крыху зьмененай, якая была на пачатку верша. Толькі ўзноў-жа не зьяўляюцца яны ў ніякім прыпадку толькі вонкавымі прычэпкамі, але вяжацца арганічна з цэлым творам і кожная з іх, хоць аднолькавая ці падобная, мае іншае артыстычнае заданьне: першая як-бы ўводзе нас у тое, аб чым будзе мова далей, апошняя-ж зьяўляецца значэнёвым і мастацкім фіналам цэлага твору

Мыляўся-б той, хто-бы думаў, што ўспомнены спосаб будаваньня верша стаўся ў Танка агульнай схэмай, ад якой недалёка да шаблёну. Хаця паэт вельмі часта ўжывае падобных прыёмаў, аднак у кожным прыпадку маюць яны іншае застасаваньне, служаць іншым мастацкім мэтам, зьяўляюцца збудаванымі на іншым слоўнікавым і рэчовым матар'яле. Чаго, чаго, але паўтарацца Танк ня любіць. Належыць ён да тых паэтаў, якія, нездаволіваючыся асягнутымі рэзультатамі, усьцяж шукаюць новых спосабаў мастацкага выражэньня, а разам з гэтым ідуць усьцяж наперад, ніколі не задзержываючыся на тым самым творчым шляху. Так напрыклад вершы Танка з „Журавінавага цьвету" зьяўляюцца з кожнага гледзішчааграмадным крокам наперад, зусім іншым і новым этапам у творчым разьвіцьці паэта, чымсьці вершы на адзін два гады ранейшыя, што ўвайшлі ў сканфіскаваны зборнік „На этапах". Перадусім у ранейшых вершах Танка зусім іншая тэматыка: пераважаюць матывы пралетарскія і вастрожныя, як сьвежы і незацёрты яшчэ ўспамін асабістых перажываньняў за жалезнымі кратамі. Пазьнейшая-ж творчасьць галоўным чынам апіраецца на матар'яле із сялянскага жыцьця, шырака ахоплівае грамадзкія пытаньні і наагул, у сувязі з шыбкім узбагачваньнем спасьцярогаў і перажываньняў аўтара, круг ягоных сюжэтаў расшыраецца.

Але нятолькі ў гэтым істотная розьніца і поступ аўтара. Вершы ранейшыя вызначаюцца прасьцінёй, а нават, сказаў-бы, свайго роду ўбогасьцю і аднастайнасьцю спосабаў экспрэсіі. Ня здолеў яшчэ Танк поўнасьцю выявіць свайго таленту, ня выкарыстаў яшчэ нявычарпаных паэтыцкіх багацьцяў беларускай мовы, не сягнуў да крыніцы народнага языка. Вершы ранейшыя — гэта сталёвы і магутны ўдар молата, грукат машын і звон сталі — сільныя, часамі нат' панурыя ў іх настроі, а мала мяккіх і лагодных пачуцьцяў, якія-б выклікалі больш багатыя і складаныя перажываньні. А ў пазьнейшых творах пясьняр, ідучы ў кірунку ўзбагачваньня сваей эмоцыянальнасьці, стараецца выкрасаць пачуцьці і перажываньні мяккія, ласкавыя, больш разнастайныя, якія глыбей прамаўляюць да нашага сэрца і пакідаюць у ім трывалы сьлед. Чытач можа пераканацца аб гэтай эволюцыі Танка хоць-бы на прыкладзе двух вершаў із падобнай тэматыкай, але зусім рознымі з гледзішча яе мастацкага апрацаваньня. Першы верш — гэта *сэзановец,* напісаны ў 1935 г. („Ма-

ладая Беларусь", кн. I і зборнік „На этапах"), які мае ў сабе ўсе асаблівасьці ранейшых твораў, а другі — гэта адзін з найнавейшых вершаў, зьмешчаны ў апошнім нумары „Калосься" пад назваю, ня зусім удалаю, *У худых руках*. Розьніца ў настроі і ў артыстычным падходзе аўтара да творчага матар'ялу ўзапраўды нязвычайная!

Працэс шыбкай эволюцыі паэта ў кірунку шуканьня штораз новых дарог, ягонае імкненьне да навасьці і арыгінальнасьці, выразна можым бачыць асабліва на большых творах песьняра. Кожны з такіх твораў, паводле свайго характару і спосабаў артыстычнага апрацаваньня, зьяўляецца ў Танка адзіным, бо кожны наступны будзе новым мастацкім экспэрымэнтам, розным ад папярэдняга. Даволі прагледзіць у хронолёгічным парадку іх паўставаньня такія творы Танка, як *З каласамі, П'яны баян, Акт першы, Да дня, Тры песьні, Песьня кулікоў, Нарач, Журавінавы цьвет і Сказ пра Вяля,* каб пераканацца аб борздым разьвіцьці аўтара і бязупынным ягоным росьце.

Характэрна, што ўспомненая ўжо вельмі сьціслая і лёгічная канструкцыя Танкавых твораў і прэцызыйнае ўпарадкаваньне паасобных яго матываў у ніякім прыпадку не агранічаюць і не дэформуюць творчых парываў аўтара. Думка аўтарава лунае заўсёды свабодна, не напатыкаючы ні на якія формальныя перашкоды, а гэтая свабода, размах і вялікі запас заўсёды арыгінальных і новых творчых магчымасьцяў зазначаецца ў кожным элемэнце Танкавага твору. Асабліва выразна і цікава зарысоўваецца гэта ў выкарыстаньні артыстычных асаблівасьцяў мовы. У гэтай галіне зьяўляецца аўтар незраўнаным мастаком, як ніводзін з дасюлешніх нашых паэтаў, і ў гэтым іменна крыецца адна з найвялікшых ягоных заслугаў. Зьвярнуў ужо на гэта ўвагу Ю. Путрамэнт у ўспомненым артыкуле, цьвердзячы між іншым, што мова Танка, адпаведна зарганізаваная з гледзішча мастацкага, зьяўляецца артыстычнай вартасьцю самой у сабе і што дзеля гэтага прадстаўляе Танк у беларускай літаратуры зусім новы мамэнт, „мамэнт адкрыцьця паэтыцкага слова".

Неабходна тутака зазначыць, што й кожны ўзапраўдны паэт стараецца выдабыць з мовы незалежныя мастацкія вартасьці, а ня толькі карыстаецца ей, як сродкам дзеля выражэньня сваей думкі ці зьместу твору. Гэтакія адносіны да мовы мы зацемім у Купалы, Багдановіча, Коласа, Ясакара, напасьледак у творчасьці паваенных менскіх паэтаў зазначыліся вельмі характэрныя экспэрымэнты ў гэтым кірунку, асабліва ў Пушчы, які многа меў падобнага і супольнага з Танкам. Вышшасьць і арыгінальнасьць Танка іменна ў тым, што ён гэтую асаблівасьць паказаў у цэлай паўніні, ува ўсей ейнай дасканаласьці. Мастацкая *функцыянальнасьць* слова, калі так назавём гэтую асаблівасьць, сталася ў Танка агульнаабавязуючым прынцыпам і мэтай самой у сабе, тады, калі ў ягоных папярэднікаў было гэта адным із другарадных артыстычных дзейнікаў. Паэтыцкае

слова ў Танка, апрача сваей вартасьці значэнёвай, мае ня меншую вартасьць эмоцыянальную, зьмяшчае ў сабе вобразныя й музыкальныя эфэкты. А калі дададзём яшчэ да гэтага, што й сынтакс Танка зьяўляецца глыбока індывідуальны, аблічаны на той ці іншы артыстычны эфэкт, дык ня будзе дзіўным, што паэт наш ёсьць „неператлумачальным“, як наракаюць тыя польскія паэты, якія прабавалі прысвоіць некаторыя творы ягоныя сваей мове.

Каб лепш аб гэтым пераканацца, прыгледзімся да аднае лірычнае дыгрэсіі ў *Нарачы* з алюзыямі да ўласнага лёсу і ролі песьняра:

Ужо ня раз і мяне адрывалі
ад сасонак і ціхіх бяроз,
ад вазёрных усьпененых хваляў,
ад сялянскіх дарог і палос.
Каласы мае град ня раз выбіў
і на помач прыйсьці я ня мог,
але сяньня аб чорныя скібы
адвастру новых песьняў нарог.
Перакіну праз плечы вясёлку
і вазьму ў рукі сонца—сяўню,
і зарой ураджаяў звонкіх
напаю вочы сінія дню.

Ужыты тут, асабліва ў дзьвюх апошніх строфках, сымболі і мэтафоры („Каласы мае град ня раз выбіў“, „Перакіну праз плечы вясёлку і вазьму ў рукі сонца—сяўню“), якія пуката канкрэтызуюць аўтаравы думкі, як-жа многа крыюць у сабе хараства і глыбокай эмоцыі іменна дзякуючы дабору слоў із адпаведным вобразным і музыкальным адценкам і іх сынтактычнаму зарганізаваньню. Такі абраз востра ўразаецца ў памяць, пабуджае фантазію, выклікае глыбокія перажываньні.

Паэтыцкая мова Танка паводле свайго агульнага характару зьяўляецца перадусім мэтафорычная. Вяжыцца гэта ў значнай меры з вялікай канкрэтнасьцю Танкавай творчасьці, аб чым была мова, бо мэтафора іменна палягае на тым, што аўтар свае думкі ці прадметы выражае пры помачы зусім іншых прадметаў, перадусім канкрэтных, ня маючых з першымі ніякай беспасярэдняй сувязі. Сувязь гэтая ці падабенства бывае паўторная, а выплывае із значэньня цэлага сказу, комплексу сказаў, а часамі нават цэлага твору. Мэтафора не зьяўляецца такім спосабам усяго толькі вонкавым паэтыцкім экспэрымэнтам, але мае вялікае артыстычнае значэньне. Ходзіць аб тое, што людзкая штодзенная мова, якая звычайна мае камунікатыўныя функцыі, зьяўляецца сама ў сабе бедная дзеля дакладнага і тонкага выражэньня паэтыцкіх сымболяў, дзеля спрэцызаваньня іх эмоцыянальнага адценьня. Дзеля гэтага паэт—мастак творыць уласную мову, паэтыцкую, адпаведна яе арганізуе паводле сваей артыстычнай лёгікі, паасобным словам і выражэньням надае іншы значэнёвы і эмоцыянальны сэнс. Вось-жа адным з найбольш важных такіх мастацкіх прыёмаў зьяўляецца мэтафора. Пры гэ-

тым мэтафора, як і кожны іншы спосаб „упаэтызаваньня“ мовы, мусіць быць заўсёды новая, сьвежая, арыгінальная, бо інакш станецца шаблёнам і страціць сваю нязвычайнасьць, сваю паэтыцкую вартасьць.

Апошнюю асаблівасьць мэтафоры добра ўсьведамляе Танк і ў гэтай галіне прыносіць шмат новага і арыгінальнага, любуецца асабліва ў сьмелых і нязвычайных злучэньнях слоў і выражэньняў, азначаючы часта прадмет ці думку, якую хоча выразіць, прадметам так далёкім паводле свайго аснаўнога значэньня, што прымушае працаваць нашую фантазію, дапаўняць розныя недаказы, злучаць паасобныя думкі. Сьмеласьць і арыгінальнасьць Танкавай мэтафоры надае ягоным апісаньням многа плястычнасьці і пукатасьці, якія выразна зарысоўваюцца ў нашым выабражэньні і выклікаюць канкрэтнае ўяўленьне абраза. Вось першы лепшы прыклад з *Песьні кулікоў:*

> Часам вецер дрэвы, зачапіўшы гужам,
> доўга іх пілуе месяца сярпом,
> і снуе на плоце белы, сьнежны кужаль
> з доўгай сьнежнай песьняй за сьляпым вакном.

Каб намаляваць такі абраз звычайнай мовай, трэба было-б пасьвяціць шмат мейсца, пры гэтым апісаньне было-б больш дакладнае і падробнае, але артыстычны эфэкт быў бы мінімальны, бо не магло-б з такой сілай і выразнасьцю сканкрэтызавацца ў нашым выабражэньні. А тут—пры помачы ўсяго толькі чатырох радкоў цэлы абраз разгортваецца перад намі ў цэлай паўніні: выразна бачым, як рытмічна калышацца вяршаліны дрэў на фоне бледнага, заслоненага сьнежнай завеяй месяца, як паміж плоту перасыпаецца белымі столкамі сухі маразяны сьнег.

Часта густа, з мэтаю ўзбагачваньня сродкаў паэтыцкай экспрэсіі, творыць Танк нэолёгізмы, пераважна ад караня існуючых ужо слоў, надаючы ім у творы пераноснае, мэтафорычнае значэньне. Зьяўляюцца яны нявымоўна прыгожыя й арыгінальныя, дзеля чаго незразумелым выдаецца, як мог Ад. Станкевіч у ўспомненым ужо артыкуле аднесьці іх у лік заганаў Танка. Тым больш зьяўляецца гэта незразумелым, што такія мастацкія наватворы, ужытыя Танкам, як *мяцеліць, журавініць, крынічыць, перазвон, кудзеліць, каласіць* і г. д., сталіся ўжо агульнапрынятымі ў сяньняшняй беларускай паэзіі і надаюць ей спэцыфічны стылёвы адценак, гэтак сама, як яшчэ нядаўна шырака ўжываныя словы *сонцавеіць, агнякцьветы* і г. д. былі спэцыяльна ўлюбленымі сымболямі ў творчасьці „нашаніўцаў“ і іхніх эпігонаў. Іншая справа, што словы гэтыя, ужытыя ў штодзеннай мове, гучэлі-б ненатуральна, як і няменш дзівачна выглядалі-б там такія звароты, як „часам вецер дрэвы, зачапіўшы гужам, доўга іх пілуе месяца сярпом“ і г. д. Такі ўжо закон мовы паэтыцкіх твораў, што мае яна многа асаблівасьцяў, якія недапушчальныя былі-б у мове звычайнай, бо напр. рытміка і рым — у паэзіі зьявішча нармальнае, у мове штодзеннай былі-б нечым сьмеш-

ным. Успамінаны ўжо Пушча значна больш за Танка тварыў падобных нэолёгізмаў, надаючы ім гэтак сама пераноснае значэньне, але былі яны ў ягонай творчасьці адно толькі зьявішчам дадатнім. Напасьледак ня трэба забывацца, што некаторыя выражэньні і словы з мовы паэта часта пераходзяць у звычайную літаратурную мову, і іменна гэта маючы на думцы, гаворым часта, што той ці іншы аўтар прычыніўся да разьвіцьця і ўзбагачаньня літаратурнага языка.

Вяртаючыся ўзноў да Танка, трэба зацеміць і з асаблівай яркасьцю падчыркнуць, што так свае мэтафоры, як і іншыя стылістычныя фігуры, будуе пясьняр, як гэта можна было бачыць хоць-бы ў зацытаваным вершы, амаль выключна на матар'яле з беларускага сялянскага жыцьця. У гэтай галіне ідзе ён за прыкладам менскіх паваенных паэтаў з Пушчай і Дубоўкай на чале, даючы, з другога боку, добры прыклад іншым нашым сучасным паэтам, на якіх творчасьць зрабіў Танк аграмадны ўплыў. Ня толькі ў тэматыцы сваіх твораў, але і ў стылю стараецца аўтар шырака выкарыстоўваць сялянскі матар'ял, а ў мове свае́й чэрпае поўнымі прыгоршчамі з мовы народнай, сялянскай, якую знае з уласнай аўтопсіі і якую старанна студ'юе на падставе беларускіх этнографічных зборнікаў. З народных слоў і зваротаў патрапляе аўтар выкрасаць многа сьвежасьці і хараства. І ці-ж не чароўныя зьяўляюцца ў яго такія выражэньні, як „п а л ы н о в а я туга“, „р а б і н а в ы я думы“, „к р у ш ы н а в а е шчасьце“ і г. д.? Усё гэта, незалежна ад ролі чыста мастацкай, мае і іншае значэньне, бо надае Танкавай творчасьці нацыянальны беларускі характар.

Элемэнты беларускага фольклёру можна заўважыць і ў рытміцы Танкавых твораў. Ён звычайна будуе з сырога народнага матар'ялу рытмічныя сыстэмы вялікай мастацкай якасьці, перапрацоўвае іх пасвойму, што з іх народных узораў астаюцца адно толькі некаторыя характэрныя асаблівасьці. І так чытач лёгка зацеміць народныя элемэнты ў рытміцы, як і ў стылю, у вершах: „Ой ня гніце, ветры, вербы над ракою“, у „Трох песьнях“, у такіх фрагмэнтах „Нарачы“, як „Ой ды на зары ды на возеры сінім“, „у людзей палосы доўгія, шырокія“, „Трэба вёсламі ударыць,—зноў Прахор гавора“ і г. д., але заўважыць так-жа, што Танк апрацаваў іх зусім арыгінальна і ўдасканаліў артыстычна. Прыходзіцца шкадаваць, што Танк адносна рэдка карыстаў дагэтуль з рытмічных асаблівасьцяў народнай песьні, якія, як і ўсе іншыя стылёвыя элемэнты нашага фольклёру, маглі-б ягоным творам прыдбаць многа першарадных артыстычных эфэктаў. Павінен зьвярнуць на гэта спэцыяльную ўвагу асабліва Танк, які ўсьцяж разьвіваючы і дасканалячы стылёвае багацьце сваей мовы, патрапіў-бы ў народнай песьні знайсьці многа сьвежых і арыгінальных узораў.

У галіне выкарыстаньня фольклёрыстычнага элемэнту асобнае месца займае ў Танкавай творчасьці невялічкая паэмка *Сказ*

пра Вяля, як цікавая спроба сягнуць да народнае крыніцы нятолькі ў стылю і рытміцы твору, але так-жа і ў ягонай тэматыцы. Экспэрымэнт удаўся вельмі добра і павучальна для многіх нашых энтузыястаў фольклёру, якія аднак, забываючыся аб тым, што форма мастацкага выражэньня праходзе шыбкую эвалюцыю, і тое, што было добрым і арыгінальным некалі, сяньня зьяўляецца перастарэлым і няцікавым, у сваіх апрацаваньнях народных матываў ня шмат яшчэ розьняцца ад Марцінкевіча. Хаця народная творчасьць вельмі шырака адбілася ў нашай літаратуры, якая ў значнай меры вырасла на фольклёрыстычным падкладзе, і хаця на працягу развою яе мы можам абсэрваваць розныя спосабы артыстычнага апрацаваньня фольклёрыстычнага матар'ялу, ад дакладнага паўтарэньня прымітыўнага народнага матыву ці формы народнае песьні аж да канцэпцыяў больш арыгінальных і скомплікаваных, Танк аднак даў у гэтай галіне неасягальныя дасюль мастацкія ўзоры. Побач з іншымі мастацкімі асаблівасьцямі „Сказу пра Вяля", якія мы ўжо знаем на падставе іншых ягоных твораў, цікавае тут тое, што народны сырэц, прымітыўны сам па сабе, апрацаваў аўтар паводле найбольш сучасных і новых артыстычных вымаганьняў. Тэму з народнае казкі разьвіў аўтар зусім свабодна, расшырыў яе і дапоўніў уласнымі элемэнтамі, што ў цэласьці прадстаўляе паэма вельмі ўдалую і арыгінальную эпіцкую кампазыцыю пры адначасным захаваньні традыцыйных, народных матываў. Гэтак сама і ў стылістычнай орнамэнтыцы рысы вельмі простыя, узятыя беспасярэдня з народных песьняў і казкаў, зьяўляюцца арганічна павязанымі з элемэнтамі найбольш сучаснага стылю. У сувязі з гэтым поўнасьцю арыгінальны сам па сабе паэтыцкі твор, апрацаваны паводле найбольш новых і сучасных вымаганьняў літаратурнага мастацтва, набірае многа сьвежасьці, нязвычайнасьці, многа няштодзенных артыстычных эфэктаў іменна дзякуючы яго фольклёрыстычнаму падкладу. Такі экспэрымэнт зьяўляецца вельмі характэрным на фоне літаратурнай сучаснасьці іншых народаў, асабліва польскага, якая, разьвіваючыся пад знакам што раз больш вырафінаваных экспэрымэнтаў, адносіцца з пагардаю да фольклёру, як асаблівасьці ўжо перастарэлай і прымітыўнай. Вось-жа Танк у „Сказе пра Вяля" ды ў успомненых фрагмэнтах „Нарачы" даў поўнае запярэчаньне гэтым неабдуманым і недасьпелым паглядам.

Падчырківаючы ўплыў народнае творчасьці на стыль і рытміку Танка, немагчыма не сказаць некалькі слоў аб ягонай рытміцы наагул і іншых акустычных элемэнтах верша. Гэтыя элемэнты, як і ўсе іншыя ў Танка, вызначаюцца ўзапраўдным багацьцем і размавітасьцю, маюць у творы вялікае функцыянальнае значэньне. Вольным парывам песьняра і ягонай магутнай пачуцьцёвасьці часамі цесна ў традыцыйных, рэгулярных рамах верша, і тады ён ламае строфічную будову, піша вершам вольным, ужываючы розных разьмераў і свабоднай рытмікі.

У сувязі з гэтым гукавая структура Танкавага верша заўсёды гармонізуе із зьместам, дапаўняе і падчырківае тое, аб чым гаворыцца ў творы. І так напр. у рытмічнай будове *Акту першага* чуваць сталёвыя выстралы і шыбкі марш зрэвалюцыянізаванага натоўпу, у другой сцэне із IV ч. *Нарачы* цяжкі 14-ці і 15-ці складовы верш адказвае павольнаму і цяжкому ходу народу на вясковай сходцы, узноў-жа оптымістычныя і мяккія лірычныя пачуцьці на пачатку VII ч. гэтае паэмы, сваё захапленьне сьвежасьцю і хараством вясковае раніцы, выражае аўтар вершам лёгкім, із выразнымі пачуцьцёвымі акцэнтамі:

Я пайду, і мо' на росах,
ды на сьцежках адгалосаў,
эх, далонямі зьбяру
залацістую зару!...

Танк наагул мае чулае вуха і ў сваей творчасьці зьвяртае ўвагу, як было ўжо гаворана, ня толькі на значэнёвы і эмоцыянальны адценак слова, але так-жа і на яго асаблівасьці музыкальныя. Дык і ў гэтай галіне патрапіў ён адшукаць у беларускай мове многа сьвежых і нявыкарыстаных дасюль паэтыцкіх эфэктаў. Дзеля прыкладу зьвернем увагу, як у *Сказе пра Вяля* пры помачы слоў і гукаў з адпаведным музукальным адценьнем выклікае пясьняр уражаньне звону камарынай песьні:

Звоняць,
звоняць камары
у цёмным лесе,
і аплёў зьвінячай зябрай сосны звон.
Эх, на вочы багатырскія ты, месяц,
лепш ня лі
салодкі
камарыны сон!

Дагэтуль мы зьврталі ўвагу перадусім на лірычныя элемэнты творчасьці Танка, бо і ёсьць ён у першую чаргу лірыкам, а ягоныя суб'ектыўныя перажываньні зьяўляюцца найчасьцейшым прадметам яго твораў. Адносіцца гэта ў роўнай меры да ягоных лірычных вершаў, як і паэмаў, у якіх, як ужо было гаворана, лірычны элемэнт бадай што пераважае над эпічным. Нягледзячы на гэта, ягоныя паэмы паказваюць, што мае Танк першарадны эпічны талент, і што ў гэтай галіне патрапіць яшчэ стварыць многа цікавага і вартаснага, а нават і тое, што ўжо даў дагэтуль, ня мае сабе роўных у беларускай літаратурнай творчасьці.

Найбольшай і найцікавейшай паэмай Танка зьяўляецца *Нарач*, правільна ўважаная за найбольш рэпрэзэнтатыўны і тыповы твор ягоны. „Нарач" гэта фактычна першы эпіцкі твор Танка, бо абедзьве меншыя яго паэмкі: *Журавінавы цьвет і Сказ пра Вяля* паўсталі пасьля заканчэньня яе. А бяручы пад увагу вялікія разьмеры паэмы, як на першы экспэрымэнт у гэтай галіне, і багацьце паасобных матываў, дык нічога дзіўнага, што некаторыя яе элемэнты апрацаваныя слабей. Пры гэтым

аўтар друкаваў паэму паасобнымі песьнямі перад напісаньнем песьняў наступных, што, зразумела, не магло ей выйсьці на карысьць. У сувязі з гэтым часткова будуць зразумелымі некаторыя пахібы ў галіне структуральнай „Нарачы", як не заўсёды добрае расплянаваньне акцыі, частае незгарманізаваньне паасобных элемэнтаў, нездавальняючае апрацоўваньне некаторых матываў, прыкладам матыву любові Тацяны і Грышкі, што, як зацеміў Ад. Станкевіч, зусім выйшла бледнай сцэна іх растаньня. Што гэтыя заганы ў пераважнай меры зьяўляюцца прыпадковымі, выкліканымі ўспомненымі ўжо варункамі пісаньня і друкаваньня паэмы, вымоўна сьведчаць *„Песьня кулікоў"* *і „Сказ пра Вяля."* Асабліва ў першым у гэтых твораў, хоць і кароткім паводле свайго разьмеру, аўтар выказаў вялікія кампозыцыйныя здольнасьці. Паасобныя элемэнты фабулы, а іх тут ёсьць аж некулькі, зьяўляюцца так містэрна павязаны і перапляцены між сабой, што разьвіваюцца раўналежна, арганічна, даючы ў цэласьці жывы і глыбока настраёвы абраз.

Вяртаючыся ўзноў да „Нарачы", мушу засьцерагчыся, што ўспомненыя заганы ў ніякім прыпадку не дыскваліфікуюць паэмы, бо ўсе іншыя яе элемэнты стаяць з гледзішча мастацкага так высока, апрацаваў іх аўтар з нязвычайнай стараннасьцю і талентам, што паэма ягоная назаўсёды астанецца монумэнтальным творам у нашай літаратуры. Немагчыма пры гэтым згадзіцца з Ад. Станкевічам, быццам „Нарач" многа страціла на тым, што аўтар не зіндывідуалізаваў сваіх герояў і не зьвярнуў належнай увагі на псыхолёгічны бок іх характараў. Спасьцярога зусім правільная, але ў ніякім прыпадку ня можна яе кваліфікаваць, як артыстычнай памылкі. Ня трэба забывацца, што „Нарач" — гэта паэма спэцыфічнага характару, у якой аўтар галоўную зьвяртае ўвагу не на штодзеннае жыцьцё наднарачанцаў, дзе-бы была-б магчымасьць, а нават і патрэба, закрануць іх псыхічныя асаблівасьці, але дае нам малюнак гэтых людзей у часе барацьбы, у мамэнт нязвычайны. Такім спосабам Тацяна, Прахор, Грышка, Сымон, Іван і іншыя рыбакі прадстаўляюць тую ці іншую ідэю, зьяўляюцца свайго роду сымболем, які трэба разумець шмат шырэй, а ня толькі ў адносінах да наднарачанскіх рыбакоў і да ўзапраўдных нідаўных выпадкаў над Нараччу. З гэтага гледзішча „Нарач" часткова можна прыраўняць да такіх твораў, як III ч. „Дзядоў" Міцкевіча, „Кордыяна" Славацкага, альбо найлепей да „Босых на вогнішчы" Чарота, дзе людзі, якія выступаюць у творы, зьяўляюцца сконкрэтызаванымі сымболямі тае ці іншае ідэі, і дзеля гэтага ня месца там на падчырківаньне індывідуальных асаблівасьцяў іх характараў.

Прыватнае-ж жыцьцё беларускіх наднарачанцаў паказаў аўтар усяго толькі мясцамі, — хаця гэтыя месцы належаць да найлепшых у паэме, — як абычаёвы фон, які аднак з акцыяй паэмы вяжыцца даволі слаба. Будзе гэта плястычны й колёрытны абраз Мядзельскага рынку і выгану ў поле скаціны. Іншыя-ж

эпізоды, як вечарынка ці пахароны Прахора — гэта арганічныя элемэнты акцыі, у якіх галоўная ўвага зьвернута на цэнтральнае пытаньне, а мамэнты штодзенныя, звычаёвыя адходзяць на задні плян. Зразумела, што аўтар мог-бы інакш расплянаваць паэму і больш прысьвяціць месца прыватнаму сялянскаму жыцьцю, і магчыма нават, што на гэтым паэма скарыстала б. Але ў дадзеным прыпадку ходзіць аб тое, што спосаб прадстаўленьня аўтарам герояў паэмы зьяўляецца правільным з гледзішча прынцыповага падходу да мэты і што дзеля гэтага, хаця і можна, а нават карысна задзержывацца над тым, якой яна магла-б быць пры тых ці іншых зьменах і дапаўненьнях, ня можна аднак з гэтага рабіць ніякіх закідаў.

Найбольш цэннымі з мастацкага гледзішча зьяўляюцца ў „Нарачы“ вельмі частыя лірычныя дыгрэсіі, аб якіх можна нагул сказаць усё тое дадатняе, што і аб іншых лірычных вершах Танка, а так-жа апісаньні беларускіх наднарачанскіх краявідаў. Гэтым апошнім, як элемэнтам эпічнага характару, трэба тут прысьвяціць крыху болей увагі. Сучасны польскі крытык С. Саснкоўскі, ацэніваючы паэму Танка, выразіўся, што „Зямля Нарачы і Нёмну ад Міцкевіча ня мела гэткага вялікага песьняра.“*) Мы аднак пойдзем крыху далей і, думаю, не памылімся, калі скажым, што Танкавыя абразы беларускага краю значна перавышаюць Міцкевічавы, як з гледзішча мастацкага іх адмаляваньня, так і з боку эмоцыянальнай насычанасьці. З Міцкевічам можа ўжо сьмела раўняцца ў гэтай галіне Якуб Колас, які першы ў нашай літаратуры даў шырокае мастацкае адбіцьцё красы наднёманскае краіны. Ягоныя апісаньні, зьмешчаныя перадусім у „Новай зямлі,“ часткова ў „Сымоне Музыку“ і прозаічных творах, нягледзячы на іх высокую мастацкасьць і глыбокі лірычны падклад, ня маюць яшчэ тэй закончанасьці і прэцызыйнасьці, што абразы Танка.

Плястыка і сакавітасьць Танкавых абразоў нязвычайная: яны зарысоўваюцца ў нашым выабражэньні проста як жывыя, толькі многа прыгажэйшыя і больш чароўныя, бо аўтар апрацаваў іх памастацку. Мастацкі падход да іх Танка вельмі цікавы: ён не апісывае іх сьцісла і дакладна, вылічаючы сыстэматычна ўсе падробнасьці, як напр. робіць гэта Колас, але высоўвае ўсяго толькі некаторыя элемэнты, якія неабходна патрэбныя з гледзішча артыстычнага. Намаляваны такім спосабам абраз творыць у сабе закончаную композыцыйную цэласьць, пры гэтым нічога ня траціць із сваей праўдзівасьці, бо аўтар дабірае найбольш тыповыя і рэпрэзэнтатыўныя асаблівасьці беларускага краявіду. Зьдзіўляе нас так-жа нязвычайнае іх багацьце і размавітасьць, што асабліва ярка зарысоўваецца ў апісаньні тых самых ці падобных аб'ектаў. Гэтак напрыклад у сваей паэме аўтар часта перарывае эпічны ход апавяданьня, устаўляючы абраз возера, і ха-

*) „Piewca Naroczy“ („Sygnały“ 1937. № 33).

ця такіх абразоў вельмі шмат, але кожны з іх прыносіць новыя рысы, зьяўляецца іншым, да папярэдняга непадобным. Ня знойдзем так-жа паўтарэньняў і ў слоўнікавым матар'яле ані ў стылістычнай орнамэнтыцы. Трэба мець нязвычайную творчую фантазію і вялікі дар слова, каб асягіваць гэткія рэзультаты.

Многа хараства зьмяшчаюць у сабе Танкавыя абразы яшчэ ў сувязі з тым, што аўтар апісывае іх ня суха і об'ектыўна, але з вялікай любоўю, падчырківаючы, падобна як і Колас, свой глыбокі да іх сэнтымэнт. А гэтую любоў і прывязанасьць да роднае краіны, з якой духова зросься пясьняр, выражае без патосу і абстракцыйнай дэклямацыі; яна, гэтак як і ўсе іншыя думкі і настроі аўтара, выплывае арганічна з самага абраза, а дзеля гэтага набірае асабліва моцы і глыбіні.

Асабліва многа шчырых пачуцьцёвых акцэнтаў знаходзім у апісаньні беларускае зямлі ў *„Журавінавым цьвеце.“* Вельмі характэрны гэты твор, які аўтару ня зусім удаўся ў скомпанованьні эпіцкае інтрыгі і ў павязаньні часткі апавядальнай з апісальнымі, прадстаўляе цікавы мамэнт, як новы, неспатыканы яшчэ ў „Нарачы“ спосаб апісаньня прыроды. У „Нарачы“ мы мелі абразы пераважна кароткія, фрагмэнтарычныя, якія арганічна вязаліся з фабулай, як яе настраёвы ці топографічны фон. Тутака спатыкаемся з апісаньнямі, пераважна незалежнымі ад ходу акцыі, прыгэтым з апісаньнямі сыстэматычнымі, падрабязнымі, захаванымі ў хронолёгічным парадку роўналежна із зьявамі ў прыродзе падчас наступаньня вясны. З гэтага боку маюць яны характар апісаньняў эпічных, а так-жа строфічны верш твору, збудаваны так, што мова разьвіваецца вельмі свабодна, быццам звычайная, штодзенная гутарка, добра надаваўся-б для эпічнай паэмы ў сьціслым значэньні гэтага слова. Абразы ў „Журавінавым цьвеце“ з боку сваей сьвежасьці і сакавітасьці пераўышаюць нават малюнкі прыроды ў „Нарачы,“ а таксама зьяўляюцца яшчэ адным крокам наперад з гледзішча іх эмоцыянальнай насычанасьці. Аўтар дае тутака поўную волю сваім захапленьням, як можа сьведчыць аб гэтым наступны цытат:

І паплылі
дні,
быццам журавы
над сьвежымі пакосамі травы,
у звоне камарыных песьняў, кос..
Начамі ціха месяц разьліець
імглы сівой і парнай малако
на хвошч балотны, асаку, круглец,
абмые і раку і берагі,
алешнік, адзінокія стагі...
Таму так сьвежы раніцы у нас, —
як моладасьць, як серабро крыніц.
Часамі ў полі думаеш ня раз,
каб як прайсьці і сінь не замуціць...

У рамах кароткага артыкулу немагчыма падчыркнуць усіх цікавых асаблівасьцяў Танкавых абразоў і зьвярнуць належную

ўвагу на іх вялікую мастацкасьць. У кожным прыпадку ня можа быць сумніву, што ў гэтай галіне, як і некаторых іншых, пясьняр наш зьяўляецца нязвычайным артыстам, якіх яшчэ дасюль ня мела нашая літаратура.

З гэтага агляду Танкавай творчасьці выплывае адна характэрная ейная асаблівасьць: абодвы, найважнейшыя сяньня кірункі літаратурнага мастацтва — лірычны і эпічны — зарысоўваюцца ў ей бадай што роўналежна і ўзаемна дапаўняюцца. А беручы пад увагу вялікі талент песьняра і шыбкую ягоную эволюцыю ад адных літаратурных асягненьняў да іншых, што раз навейшых і дасканальшых, зусім на часе будзе ўвага Ад. Станкевіча, што Танк павінен ужо падумаць аб стварэньні беларускага нацыянальнага эпосу. Гэтую думку астаецца толькі падхапіць, разьвіць шырэй, тымбольш, што апошнім часам пачалі ў нас наракаць за ініцыятывай самога-ж Танка, што нашая літаратурная крытыка займаецца толькі сартаваньнем паэтаў, інвэнтарызацыяй мэтафараў, ды наагул „цягнецца" з-заду за паэзіяй. Плястычныя і колёрытныя апісаньні быту беларускага сялянства ў „Нарачы," містэрныя абразы прыроды і беларускае зямлі, асабліва ў „Журавінавым цьвеце," як напасьледак выказанае ўжо ўменьне конструаваньня большых эпіцкіх композыцыяў, нягледзячы на некаторыя пахібы ў „Нарачы" і „Журавінавым цьвеце," вымоўна сьведчаць, што Танк ужо дасьпеў, каб стварыць у нашай літаратуры тое, чаго не ўдалося належна выканаць Коласу ў „Новай зямлі." Рэалізуючы гэты плян, меў-бы аўтар шырокую магчымасьць выявіць свой талент у галінах зусім новых, амаль незакранутых яшчэ дагэтуль, іменна ў галінах эпіцкага адмаляваньня прыватнага, штодзеннага жыцьця беларускага народу, адлюстраваньня найбольш тыповых і зіндывідуалізаваных характараў і іх псыхолёгічных асаблівасьцяў. Прыгэтым мог-бы выкарыстаць у большай ступені асаблівасьці народных гутарак і дыялектаў, індывідуалізуючы мову найбольш тыповых герояў, ды і ў галіне апісаньня беларускіх краявідаў меў-бы шырэйшае поле для мастацкіх экспэрымэнтаў. Але гэта справа недалёкае будучыні.

Ды ўжо і сяньня, ацэніваючы паэтыцкую прадукцыю Танка на падставе таго толькі, што нам даў дагэтуль, даходзім да вывадаў вельмі важных, так для самога песьняра, як і ўсяе беларускае літаратуры наагул. Уся Танкавая творчасьць, разгляданая на фоне дасюлешняй беларускай літаратуры і ў сувязі з найнавейшымі яе праявамі, не зьяўляецца ўжо ў ніякім прыпадку прадаўжэньнем і дапаўненьнем іх. Наадварот, пералічаныя асаблівасьці творчасьці Танка зьяўляюцца асягненьнямі зусім новымі, неспатыканымі дасюль у нашай літаратуры; калі-ж і ня ўсе з іх можна закваліфікаваць у такі спосаб, то ў найлепшым прыпадку будуць яны высокім мастацкім удасканаленьнем таго, што мелі мы дагэтуль. Пры гэтым варта зацеміць, што Танк патрапіў ужо надаць свой тон іншым нашым паэтам, аб чым найлепей

можа сьведчыць найнавейшая творчасьць Арсеньневай, Васілька, Машары, Івэрса, Тарасішкі і інш. Творчасьць гэтых паэтаў пад Танкавым уплывам значна ажывілася, набрала больш самапэўнасьці і разгону, мацней зраслася з беларускім сялянскім грунтам, прыбліжылася да сучасных плыняў літаратурнага мастацтва. Такім спосабам Танк, пасьля Купалы і Коласа, як іхніх сучасьнікаў, якія фактычна стварылі нашую літаратуру ў сьціслым значэньні гэтага слова, распачынае новую эпоху — эпоху поўнага і ўсестароньняга ўдасканаленьня яе мастацкіх вартасьцяў.

Прысьвячаю А. Чарняўскай-Орсе

* * *

Ёсьць варажбітныя травы
з папарацьцю кучаравай, —
быццам яны ўсё ліхое
дзіўнымі чарамі гояць.
Ў'ецца зялёная сьцежка.
Нейчая ў песьнях усьмешка
бліснула ярка і сіня, —
нават ня ведаю імя.

Лепей каб звалася Рутай,
Шчасьцем, Палярнаю зоркай,
а не Купальскай атрутай,
Сном ці Няволяю горкай.—

Рутай украсіш, што хочаш;
Шчасьцем нат' песьні напоіш;
Зорка у цёмныя ночы
будзе гарэць над зямлёю.
Але з атрутай і снамі,
але у сэрцы з няволяй, —
пойдзеш якімі трапамі
у каласістае поле?...

Нешта над рэчкай варожаць,
месяц, аер і бярозы
і забабонныя травы
з папарацьцю кучаравай.

Вільня, 22.III.38.

М. ТАНК

АД. СТАНКЕВІЧ

Міхал Забэйда-Суміцкі і беларуская народная песьня

* * *

1. Таёмна-жудасны абраз прадстаўляе неба ў непагодлівы час, калі снуюцца па ім грозныя хмары і цалком засланяюць сабой і месяц і зоры. Неправідная цемра муча фізычнае вока чалавека, якое праз гушчыню хмар ня бача нічога, а бачыць і жадае і мусіць, бо такая яго прырода. І скольні-ж бывае радасьці для вока, калі бура міне і вецер хмары прагоне, а на небе ўзноў заз'яюць мігатлівыя, бязлікія зоркі, вяшчункі лепшага часу, вяшчуньні пагоды.

Нешта падобнае дзеецца і ў сьвеце духовым чалавека. Недахопы інтэлектуальныя і маральныя ў душы чалавека, як цёмныя хмары, засланяюць яго кругазор — духовую ўяву, а перамога іх і дапаўненьне дадатнімі духовымі вартасьцямі, як зоры, нясуць пачуцьцё сьвятла й радасьці.

Ня інакш дзеецца і ў жыцьці кожнага народу. Ягоны сон і дрэмка, яго нацыянальная нясьведамасьць — гэта сапраўды цёмныя хмары, што закрываюць прад ім належны яму ягоны жыцьцёвы шлях, спыняюць яго гістарычны культурны працэс і адымаюць яму творчую радасьць і паўнату жыцьця. І кожны праяў у народзе нацыянальнай сьведамасьці, асабліва ў даравітых і таленавітых сынох народу,—гэта тыя зоркі, што асьвячаюць народны небасхіл, вясьцяць яму сьветлае жыцьцё і паказваюць на адпаведныя для яго шляхі ў ягонай культурнай падарожы.

Гэтыя даравітыя і таленавітыя сыны народу, гэныя яго зоркі, — гэта яго вучоныя, паэты, пісьменьнікі, рожнага роду іншыя мастакі: сьпевакі, музыканты, маляры, плястыкі і інш. а так-жа ідэйныя і самаахвярныя барацьбіты — палітыкі, дзеячы і ім падобныя.

І на беларускім нацыянальным небасхіле яўна бачым, як усьцяж паяўляюцца новыя й новыя таленты, новыя нацыянальныя зоркі, якія зганяюць з павек народу сон, абуджаюць яго да нацыянальна-сьведамага жыцьця, пачуцьцём нацыянальнай сьведамасьці, як соцыяльнай вязяй, спалучаюць яго ў вадну сьведамую цэласьць і, авеенную нацыянальнай сьведамасьцяй, пабуджаюць волю народу да творчага дзеяньня, да барацьбы з цемрай ў імя сьветлых, жыцьцёвых ідэалаў.

Аднэй з такіх новых зорак на беларускім нацыянальным небасхіле ў Польскай дзяржаве зьяўляецца ад некалькіх ужо гадоў мастак-сьпявак Міхал Забэйда-Суміцкі. Слухаюць яго сьпевы не Беларусы і бачаць у ім, — аб чым сьцьвярджаюць публічна — мастака сьпевака высокай маркі, мастака-сьпевака з Божай лас-

кі. Слухаюць яго Беларусы, асабліва беларускую народную песьню: асабіста-беспасрэдна, праз радыё ці з пліткаў патэфону і... захопліваюцца, бо чуюць і бачаць вухам душы сваей у гэтай песьні вялікі свой культурны скарб, частку душы сваей, якая напаўняецца красой і ажывае да паўнейшага і лепшага жыцьця, калі гэнай душы датыкаюць тоны беларускай песьні, што льецца з грудзей мастака-сьпевака М. Забэйды.

* * *

2. У прыродзе ня роўнасьць, не аднольковасьць, але рожнароднасьць існуе, а нават і рожнавартаснасьць. Так напрыклад, апрача звычайных нашых шаракоў каменьняў і апрача звычайнай жалезнай руды, існуюць так зв. дарагія і высокацэнныя каменьні і мэталы. Падобную рознаякасьць і рознацэннасьць спатыкаем і ў жыцьці чалавечым. Адных прырода-маці абдарыла дарамі-талентамі дужа багата, другіх менш шчодра, а іншых сусім скупа. Але й тыя, што багата абдараваны дарамі, незаўсёды аб гэтым ведаюць, незаўсёды могуць выявіць свае дары і падзяліцца імі з іншымі, а так-жа й са стараны людзі незаўсёды гэтыя дары могуць ўгледзіць, належна ацаніць іх і памагчы іх разьвіцьцю. Такім чынам шмат розных, часта і дужа вялікіх, талентаў у людзей не выяўляецца сусім і гіне, або выяўляецца недастатачна. Выяўленьню талентаў і іх згубе дужа спрыяюць усе тыя абставіны, у якіх чалавек жыве: асабліва час са свомымі яму духовымі плынямі, якімі чалавек звычайна праймаецца, так ці інакш на іх рэагуе, і — асяродзішча, у якім чалавек жыве, з якім пастаянна стыкаецца і — так ці інакш — часта сусім нясьведама, паддаецца яму, праймаецца ім, або бунтуецца процiў яго.

Міхал Забэйда (па матцы Суміцкі) радзіўся на самым пачатку XX ст., у 1900 годзе, у беднай сялянскай сям'і ў сяле Шэйпякі, Пружанскага пав. Гэта ўжо беларускі этнаграфічны рубеж, а на рубяжох заўсёды крысталізуюцца даравітыя тыпы народу. З Пружаншчыны паходзіць і Р. Шырма, ведамы працаўнік на ніве культуры беларускай песьні і кіраўнік слаўнага Беларускага хору ў Вільні.

Навокал сябе падрастаючы Міхась бачыў расейскае, чужое яго душы вялікадзяржаўе, якое кідалася ў вочы ў царкве, школе, у паліцыі, войску і г. д., а так-жа бачыў і балюча адчуваў сялянскую социяльную крыўду, жывым прыкладам чаго былі чужыя нацыянальна двары, іх адносіны да сялян, асабліва да службова залежных ад іх парабкоў і агулам тая іх роль, якую яны, як асьвечаная і багатая кляса, праводзілі сярод чужога сабе беларускага народу.

Ня мог гэтага ўсяго ня бачыць і не адчуваць малады Міхась, асабліва калі скончыў пачаткавую мясцовую школу і ўжо вучыўся ў вучыцельскай сэмінарыі ў Маладэчне падчас сусьветнай вайны, якая такім страшным цяжарам звалілася на Бела-

русь і калі Вялікая Расейская Рэвалюцыя ўвесь стары, згніўшы грамадзкі лад, вярнула дагары дном.

Першыя 20 гадоў XX ст., гэта першыя 20 гадоў жыцьця М. Забэйды, калі складаўся і аформліваўся яго характар. Тады быў гэта час накапленьня з аднаго боку вялікага запалу і энэргіі, як духовай, так і матар'яльнай у Расейскай Імпэрыі (навука, промысл) коштам „інородцев," „іноверцев" і соцыяльна акінутых кляс, а з другога — гэта час вялікага напружаньня большасьці расейскай і не расейскай інтэлігенцыі і работнікаў, якія ставілі на карту ўсё, абы толькі вырвацца на шлях лепшага, вольнага жыцьця.

Міхась Забэйда, мастак з натуры, уражлівы, мяккі, працавіты і інтэлігентны ўсё гэта, што навокал яго дзеелася, жыва й глыбока адчуваў, перадумваў, студ'яваў і, ня сьмела прабуючы загаду свайго таленту, выяўляў свае пачуцьці і перажываньні ў песьні. Народныя беларускія песьні, прадусім якія ён чуў ад сваей маці, цягнулі яго і праймалі асабліва. Гэта душа будучага мастака ўжо тады, яшчэ нясьведама, адчувала беларускую народную стыхію, у якой, казаў-бы ў люстры, шмат чаго адбівалася, што ён, пры сваім разьвіцьці, ужо ненавідзеў, або любіў. Словам, адрываючыся ад старога і становячыся на новы шлях падчас вайны і рэвалюцыі, М. Забэйда, між іншым, яшчэ падсьведама станавіўся ўжо на беларускі нацыянальны шлях. Спрыяла гэтаму так-жа і праца ў Вучыцельскай Сэмінарыі ў Маладэчне над беларускім народным фольклёрам, што хоць рабілася з мэтай русыфікатарскай, мела й дадатныя староны, бо спрыяла сэмінарыстам безпасрэдна і ў некаторай меры навукова, стыкацца з беларускай стыхіяй, ужо шмат шырэйшай, як родная вёска і як песьня роднай маці. Далей нацыянальнаму пачуцьцю М. Забэйды спрыяла вайна і рэвалюцыя, праз якія дакаціліся і на Беларусь вялікія ідэалы самаазначэньня народаў.

Вось больш менш тая атмасфэра, якой аддыхаў Міх. Забэйда, вось больш менш тыя абставіны яго жыцьця, у якіх ён жыў, вучыўся і разьвіваўся духова, вось больш менш тое, што спрычынялася да разбуджэньня й выяўленьня ня толькі агулам мастацка-сьпявацкага таленту ў яго, але так-жа выяўленьня таленту мастака-сьпявака Беларуса і што спрычынілася да таго, што М. Забэйда знайшоў самога сябе.

* * *

3. Прыгледзімся бліжэй да жыцьцёвай „мэтрыкі" М. Забэйды. Ваенная завяруха адарвала яго ад роднай краіны і выкінула на шырокія ўсходнія прасторы быўшай Расеі. Пабываўшы ў беларускім Смаленску, трапіў у Пэнзу, у Барнаул на Сібіры і ўрэшце апынуўся аж у далёкай Манджурыі ў Харбіне. У гэтым часе скончыў ён вучыцельскую сэмінарыю, вучыцельскі інстытут і ўрэшце ў Харбінскім унівэрсытэце скончыў эканамічны аддзел юрыдычнага факультэту. Здабываючы асьвету, адначасна праца-

ваў ён як настаўнік у розных школах, а ўрэшце ў гандлёвай школе ў Харбіне.

Да сьпеву М. Забэйда меў пацяг змалку. Аб сьпеве праз увесь час сваей моладасьці ён не забываўся ніколі. Вучачыся й зарабляючы на кавалак штодзеннага хлеба, ён заўсёды знаходзіў крыху часу й для песьні. Але да Харбіну сьпеў М. З. уважаў хутчэй забаўкай, культурнай і прыемнай разрыўкай, а ня мэтай свайго жыцьця й вышэйшым прызваньнем. І толькі ў Харбіне М. З. свае дасюлешнія адносіны да сьпеву зьмяніў прынцыпова й сыстэматычна й грунтоўна пачаў працаваць, як над сьпевам, так і над музыкай агулам. Прафэсарамі яго ў гэтым былі: партнэрка Шаляпіна Юлія Плотніцкая, Мэттэр і Томашынская. У гэтым часе пачынае ён першы раз выступаць у Харбінскай Опэры, як саліст, у опэры „Евгеній Онегін“ — Чайкоўскага ў ролі Ленскага, у ролі князя ў опэры „Русалка“ — Даргомыжскага і ў ролі Леля ў опэры „Снегурочка“ — Рымскага — Карсакова.

У расейскай і кітайскай прэсе паявіліся галасы крытыкі, якія зразу М. Забэйду ацэньвалі, як вялікага сьпевака-мастака. Гэтак напр. пасьля выступленьня М. Забэйды у „Евгеній Онегіне“ Харбінская расейская *„Зоря“ у № 300* з 1929 г. пісала: „Ему (М. Забэйдзе) отлично удалась сцена на балу у Лариных, но в сцене дуэли он превзошел ожиданія.“ Узноўжа кітайская газэта „Гунбао“ ў тым-жа часе піша, што „чуткій музыкальный певец Забэйда старается осмыслить роль в мельчайшых деталях и по возможности перевоплотиться при исполненіи роли. Артист со временем наверное будет пожинать лавры на этом завидном поприще.“ Крытыка дужа трафная і аказалася прарочай.

М. Забэйда, як праўдзівы мастак і як інтэлігентны чалавек, хвальбы гэтай слухаў цьвяроза, не ўпіваўся ей і не спачываў на лаўрах. Ён крытычна адносіўся да крытыкі і праўдзівыя яе староны стараўся выкарыстаць для далейшага лёсу і разьвіцьця свайго сьпявацкага таленту.

У 1932 г. М. З. пакінуў Харбін і выехаў у Італію, у Мілан, каб там далей папрацаваць над сваім голасам. Працаваў ён там пад кіраўніцтвам ведамага прафэсара Фэрнандо Карпі. Дзякуючы здольнасьці і працавітасьці мастака, праца яго пашла тут значна ў перад. Прафэсар Карпі даў яму добрую рэкомэндацыю і ён дастаўся ў Міланскую Опэру. Італьянская музычная крытыка ацаніла яго ня толькі дадатна, але і высока. Так напр. афіцыяльны орган Акадэміі Музыкі *„Giornale del arte“* прыраўняў М. Забэйду з вялікай славы італьянскім тэнарам М. Скіпай, а так-жа з слаўным расейскім сьпеваком Л. Собінавым. Ня інакш да яго адносіліся і іншыя італьянскія крытыкі, маючы нагоду прыслухацца да яго сьпеваў падчас яго разьезду па Італіі. Гэтыя крытыкі трафна паказвалі на адну з галоўных выдатных старон сьпеву Забэйды, гэта на яго сьпявачую інтэрпрэтацыю, на тое іменна, што ён пяе ня толькі голасам, але й душой. Напр. *„Corriere di Savona“* пісала: „Тэнар Міхал Забэйда-

Суміцкі і гэтым разам пацьвердзіў здабычы з апошніх сваіх артыстычных падарожаў. Ён здраджае ўражлівую душу мрыючага паэта, гэтак характэрыстычную для славянаў. Ягоны голас робіць уражаньне дасканальнага інструманту, які здабывае і чаруе слухачоў."

Прабыўшы ў Італіі бадай чатыры гады, М. З. у 1935 г. вярнуўся ў родны край, на Бацькаўшчыну, з якой роўна 20 гадоў быў у разлуцы. У Шэйпякох застаў старэнькую маці, з каторай пісьмамі ўсьцяж падтрымліваў лучнасьць і праз якую, як праз адзінае злучво, быў у жывым кантакце з беларускай стыхіяй. Пабыўшы на Бацькаўшчыне і выступіўшы з некалькімі канцэртамі, знашоў вялікае зацікаўленьне ў польскіх музыкальна-сьпявачых кругох і быў запрошаны ў Пазнанскую Опэру. Запросіны гэтыя сьпявак наш прыняў і выступаў там салістым, у галоўных ролях, у опэрах: „Галька" — Манюшкі, „Рыголетто" — Вэрдзі, „Сэвільскі цырульнік" — Россіні, —„Фауст" — Гуно, „Uprowadzenie z Seraju" — Моцарта, „Юлій Цэзар"— Гэндля, „Евгеній Онегін" — Чайкоўскага і інш.

Аставацца аднак далей у Пазнані М. З. не жадаў. Яго цягнула ў большы мастацкі сьвет, на шырэйшыя сьпявачыя прасторы. Дзеля гэтага, калі скончыўся час яго ўмовы з Пазнанскай Опэрай, ён пераехаў у сталіцу Варшаву. Тут дае канцэрты, пяе ў Польскім Радыё, выяжджае з канцэртамі на правінцыю, а такжа й заграніцу, як Рыга і Талін. У гэтым пэрыядзе свайго жыцьця і працы на сьпявачым грунце М. З. апрача вытрывалай далейшай шліфоўкі свайго таленту агулам, ён асабліву ю зьвярнуў увагу на беларускую народную песьню, у якой выявіўся, як сапраўды вялікі і адзіны ў гэтым родзе мастак на беларускім небасхіле.

* * *

4. І што-ж, вярнуўшыся з далёкіх краёў і асеўшы настала ў Варшаве, мо' мастак наш спачывае на старых ляўрах, карыстаючы з тэй славы, якую ўжо здабыў за граніцай і якая ўжо цьвёрда ўстаноўлена? Не! Мастак наш свайго таленту ў зямлю не закопвае, а дасканаліць яго і далей разьвівае, робячы ўсьцяж новыя поступы. Слава яго, якой ён дазнае за свае сьпевы ў Варшаве, на правінцыі і за граніцай — гэта слава ўсьцяж дасканаленага і паступаючага ў перад таленту. Аб гэтым сьведчаць рэцэнзыі як у польскіх газэтах розных кірункаў, так і ў газэтах жыдоўскіх і расейскіх.

Асабліва захапілі варшаўскую польскую публіку выкананыя Забэйдай грэчанінаўскія беларускія народныя песьні на канцэрце ў Варшаўскай кансэрваторыі 27 лютага 1937 г., якія артыст быў змушаны паўтараць. Віленскае „*Słowo*", даючы агляд рэпэртуару М. Забэйды-Суміцкага і яго выступленьняў у Варшаве і ў Пінску, між іншым пісала: „нязвычайная музыкальнасьць, пекны голас, вельмі добра апанаваны тэхнічна ўва ўсіх дынамічных сту-

пенях, надзвычай павабная вонкавая індывідуальнасьць артыста і выразная інтэрпрэтацыя твораў з рознаякімі настроямі, падымаюць артыста да праўдзівых нештодзенных эстрадных зьяваў.“

А вось што піша аб Забэйдавых песьнях яго аднапаветнік, які першы парадзіў яму і памог ськіваваць ягоны талент на беларускую песьню, вышэй тут успамінаны, дужа заслужаны для беларускай сьпявачай культуры, Р. Шырма:

„Што-ж датычыць радыёвых канцэртаў Забэйды, то можна сьмела сказаць, што яны зьяўляюцца скарбам для Польскага Радыё. Такога сьпевака, такога выяўіцеля народнай душы, асабліва ў народных песьнях, — усёроўна польскіх ці беларускіх — у Польшчы нам не прыходзілася чуць. Нават праслаўлены Кепура не перадасьць і ня здоляе так далікатна выявіць усей глыбіні польскага народнага музыкальнага духу, як гэта ўмее зрабіць М. Забэйда-Суміцкі з польскімі народнымі песьнямі. Калі ў Кепуры стыхія голасу забівае душу, зводзіць усё да нямецкае халоднасьці, то ў Забэйды-Суміцкага наадварот — голас разам са словам служыць для выяўленьня ўсіх тых адценьняў, нават самых далікатных і тонкіх у перажываньнях і настроях, якія захаваны ў песьнях.“ (*„Калосьсе“ № 2 (11) 1937*).

Віленскае грамадзянства, як беларускае, так польскае і іншае бліжэй пазнала Забэйду, як сьпевака ў сьнежні месяцы ў 1936 г. падчас сьвяткаваньня Беларускага Дня Культуры, а пасьля вясной і ў сьнежні 1937 г. на канцэртах, ладжаных Беларускім Студэнцкім Саюзам.

Вясной мінулага году канцэрт М. Забэйды адбыўся ў Вільні 16.V. З гэтай нагоды ў польскай газэце *„Słowo“* (*Nr. 135, 18.V.37*) ведамы кампазытар і музыкальны крытык праф. М. Юзэфовіч пісаў гэтак:

„Канцэрт, сарганізаваны Беларускім Студэнцкім Саюзам УСБ, адбыўся ў запоўненай залі Сьнядэцкіх УСБ з нязвычайнай мастацкай удачай.

Гэтак удалы вынік быў перадусім дзеля таго, што ў канцэрце браў удзел ведамы ўжо Вільні малады тэнар *Міхал Забэйда-Суміцкі*, які здабывае штораз большы розгалас у розных эўрапэйскіх краёх. Яго мілагучны, дасканальна апанаваны голас, у спалучэньні з вялікай артыстычнай культурай, ёсьць на ўслугах выкананьня, перасычанага беспасярэднім нутраным адчуцьцём зьместу твораў і іх настрою. Выразная і акуратная дыкцыя, у чатырох языках, узмацняла ўражаньне вельмі сымпатычнага і высока-мастацкага сьпеву. Усе прадукцыі былі на вельмі высокім мастацкім роўні, як небісаваныя, так — з прычыны спэцыяльнай папулярнасьці твораў, як арыя Ленскага — бісаваныя, якія выклікалі шчыры энтузыязм, выяўляны ў гураганных воплесках і многіх дарах кветкамі.“

Пасьля гэтага канцэрту пісала аб Забэйдзе як аб мастаку ў самых супэрлятывах так-жа прэса расейская (*„Русское Слово“*) і жыдоўская.

Сіріус, рэцэнзэнт-крытык з Русскаго Слова," падчоркнуўшы М. Забэйду. як мастака-сьпевака агулам, з захопленьнем зварачваў увагу на яго, як на мастака-сьпевака беларускай народнай песьні. У гэтай галіне выкананьне М. Забэйды — піша Сіріус— зьяўляецца ўжо сапраўднай рэвэляцыяй: беларускую народную песьню ўздымае ён на вышыню, якая ня сьнілася ні яе творцународу, ні яе навейшаму мастаку-гарманізатару. І трэба добра ацаніць асабістую шляхотнасьць артыста, які родную сваю песьню моцна трымае ў сваім сэрцы і нясе яе з сабой і на польскую і далей на эўропэйскую эстраду, ня гледзячы ні на якія перашкоды"... (*„Калосьсе" кн. 3, 1937, артыкул М. С.—„На службе вокальнага мастацтва"*).

А вось найсьвяжэйшыя галасы крытыкі польскай сталічнай прэсы. Пад канец лістапада 1937 г. у „Stowarzyszeniu Miłośników Dawnej Muzyki" адбыўся вечар-канцэрт. *„Express Poranny" (Nr 330 28.XI.1937)* аб гэтым так адзываецца:

„Bohaterem wieczoru wypadnie nam nazwać p. M. Zabejdę-Sumickiego, którego publiczność po prostu nie chciała wypuścić z estrady. Rzeczywiście jest to bardzo niepowszedni talent śpiewaczy: co za muzykalność, jaki temperament, ile humoru! Z przyjemnością wysłuchaliśmy całej grupy aryj włoskich (Carissimi, G. Gaccini, Scarlatti, Giordani). Nareszcie tenor, który dba nie tylko o efekt wokalny, ale i o ekspresję!"

Аб выступленьні М. Забэйды на тым-жа канцэрце, у газэце *„Nasz Przegląd"* (*Nr 341; 1.XII.1937*) ведамы музычны крытык, які піша пад крыптонімам М. Cent., вось што кажа:

„Prawdziwą radością dla wielbicieli „bel canta" były pieśni włoskich mistrzów z XVII i XVIII stuleci w interpretacji p. Zabejdy-Sumickiego. Nareszcie zdając relację o występach miejscowych śpiewaków, można napisać coś o umiejętności prowadzenia głosu, świetnie upozowanego na masce, zwrotnego w falsetach, filowaniu i koloraturze. P. Sumicki jest wokalistą najlepszej próby: rozumie i kocha swój instrument. Każdy akcent ekspresyjny znajduje w jego wykonaniu doskonałe techniczne i muzyczne rozwiązanie. „Mezza voce," legato, crescendowanie dają słuchającemu prawdziwe zadowolenie estetyczne, nie budzą obawy o załamanie się w jakimś trudniejszym przejściu lub fermacie. W śpiewie p. Sumickiego ekspresja pasuje do objętości głosu, objętość odpowiada skali dynamicznej, dynamika — ekspresji. Tak jak to ma miejsce u każdego dobrego włoskiego śpiewaka, który niezależnie od gatunku głosu posiada umiejętność wydobycia z niego wszystkich możliwych odcieni barwy i ekspresji. Prawda, że głos p. Sumickiego nie należy do silnych. Ale jaka w nim elastyczność, śpiewność i finezja poddana regułom dobrego smaku i nieprzeciętnej muzykalności."

Так, Забэйда — гэта вялікі сьпявачы талент, талент — да таго — жывы, які яшчэ ня скончыў расьці і разьвівацца. Доказам гэтага, апрача вышэйсказанага, служаць галасы сярод польскага музычнага грамадзянства, якія Забэйду, як мастака, вышэй

ставяць, як Кепуру, а так-жа доказам гэтага найсьвяжэйшае ў Вільні выступленьне Забэйды на канцэрце ўзноў Бел. Студ. Саюзу 12.XII.37, на якім віленскае грамадзянства асабіста праканалася і аб сучаснай статыцы Забэйдавага таленту і аб яго далейшай дынаміцы. М. Забэйда як сьпявак-мастак апошняга свайго слова яшчэ не сказаў. Яно яшчэ ў перадзе. Яно выявіцца ў беларускай народнай стыхіі, у беларускай народнай песьні. Там — на наш пагляд — найвялікшая Забэйды будучыня, там яго праўдзівае прызваньне.

* * *

5. Асаблівасьцяй псыхічнай будовы кожнага чалавека зьяўляецца ягонае імкненьне да творства. Кожны чалавек, адпаведна да свайго культурнага разьвіцьця, нешта твора, нечым узбагачвае, паляпшае і прыхарашвае сваё жыцьцё. Вынікі такой творчай працы чалавека, хоць-бы яны былі і сусім малыя і нязначныя, агулам называюцца культурай.

Нешта падобнае дзеецца ня толькі ў людзкой адзінкі, але так-жа і сярод кожнай людзкой грамадзкай супольнасьці, сярод кожнай соцыялёгічнай адзінкі, як напр. народ.

Гэтае агульнае правіла псыхічнай будовы чалавека адносіцца так-жа і да беларускага народу. І наш народ, паслушны свайму творчаму інстынкту, нямала даканаў у сваей гістарычнай падарожы, як у галіне культуры матарыяльнай, так і духовай. Даволі хоць-бы толькі збольшага запазнацца з бібліографіяй з галіны беларускага народнага фольклёру, каб аб гэтым пераканацца.

Часткай беларускай народнай культуры зьяўляецца беларуская народная паэзія, выражаная ў песьні. Частка гэта дужа багатая й рознародная. Польскія й расейскія галасы, якія яшчэ й сяньня можна пачуць аб паэтыцкай быццам убогасьці беларускай народнай песьні, належаць да легендаў, якія ў сабе ня маюць праўды.

Ведама, дагэтуль наша песьня мала распрацавана і мала дасьледжана. Згэтуль, відаць, гэтыя крыўдныя аб ей паяўляюцца легенды. Але й з таго, што маем аб нашай народнай культуры агулам (акадэмік Карскі, Насовіч, П. Безсонов, Малевіч etc.) можна ўжо непахібна судзіць аб тых вялікіх эстэтычных вартасьцях нашай песьні, якімі яна так арыгінальна і дзіўна багата.

Вось-жа некаторыя для прыкладу галасы аб нашай песьні з 70—80-х гадоў мін. ст.: „Белорусскія простонародныя песні можно назвать безискусственным, но не лишенным изящества изложеніем чувст простого, необразованнаго народа при радостных, забавных, не менее как и при скорбных, печальных и непріятных обстоятельствах жизни человека.

Белорусскія песни очень многія составляют глубокую старину, из века в век устным единственно путем перешедшую

к нынешним простолюдинам, и эти старинныя песни носят тип Славянскаго, а в особенности Кривичскаго племени ..

Древность Белорусских песень ясно видна из следующих обстоятельств:

1) В песнях, распеваемых и ныне Белорусскими простолюдинами, оказываются слова совершенно вышедшія из употребленія в живом простонародном говоре, как-то: бояре, боярочка, Лях — Поляк, Царь-город, шарварка, шестак и другія.

2) Выражаются древнія воинскія обстоятельства, напр.:

Едуць татарскія раци
Хочуць твайго каня ўзяци.

3) В старинных Белорусских песнях, и ныне употребляемых Белорусскими простолюдинами, выражается дух не крестьянскаго быта, а свободнаго и самостоятельнаго сословія и даже богатаго, как-то:

Баяры (сваты) вороты аблягли,
Пасыпали золата па скам'и...

Чем древнее Белорусская песня, тем, кажется, более проглядывает в ней образованность и изящество творчества...

Поэтическія красоты, которыми отличаются старинныя песни, заставляют заключить, что Белорусское Кривичское наречіе в старину было уделом не одного Белорусскаго простонародія, но и высшаго класса народа, который не лишен был совершеннаго образованія...

Во всех Белорусских песнях, и в особенности старинных, господствует тоническое стихосложеніе, в котором удареніе главнаго в смысле слова подчиняет себе всех прочих слов слоги и ударенія так, что Белорусскій стих состоит из пиррихіев и сугубых амфибрахіев, независимо от числа слогов. Напр. Камарочки мае.

Пад им коник брое,
Капыцикам землю крое".

(*И. И. Носович — Белорусскія песни: предварительный взгляд на характер белорусских песень*)

А вось яшчэ голас аб беларускай песьні іншага даўнейшага дасьледчыка беларускай народнай духовай культуры, які кажа, што творства гэта ў свой час кіпела ўсей сілай: „песнею и стихом, не широкими и не длинными, а в тысяче видов, с изящным и частію шутливым характером, оглашался весь этот видимый и невидимый образ жизни народной: довольно сказать, что Слово о Полку Игореве без нея убавилось бы на треть, что многое для целаго славянскаго песнотворчества сгибло-бы неясным и неполным без ея наследія, даже в теперешних его остатках предлежащих читателю". *(И. Безсонов — Белорусскія песни, Москва 1871: В об'ясненіе к изданію).*

А калі да гэтых галасоў дададзём усё тое, што для беларускай народнай песьні зрабілі сучасныя кампазытары (Галкоўскі, Грэчанінаў, Евец, Уладзімірскі і інш.) і Рыгор Шырма з сваім

хорам, — дык можам мець абраз поўны і цалком пазытыўны што да эстэтычнай, паэтыцкай вартасьці нашай народнай песьні.

Аднак далейшы развой гэтай песьні, як і агулам далейшы развой культуры беларускага народу, як ведаем, у пэўным часе спыніўся. Чужыя зайздросныя багі забраліся на беларускі Алімп, прысабечылі сабе беларускія культурныя скарбы, а чаго прысабечыць не ўдалося, — на тое палажылі калдунскія свае пячаці і паставілі свае стражы, каб з гэных скарбаў далей ня можна было карыстацца. Але дарма!

Грэцкі Зэус агулам часта крыўдзіў людзей, а найбольш тым, што зайздросна сьцярог нябеснага агню і не даваў людзям сьвятла й цяпла. Промэтэй ня сьцерпіў гэткай людзкой крыўды і ўкраў ад Зэуса нябеснага агню і надзяліў ім людзей. Пайшло на зямлі жыцьцё — сьветлае, цёплае, радаснае, творчае! А Промэтэя пачаліся цярпеньні. За яго адвагу і любоў да людзей Зэус прыкаваў яго да скалы Каўказу. Штодня прылятаў каршун і выядаў яго печаньні, але гэтыя ўсьцяж адрасталі і Промэтэй цярпеў і нябеснага агню варочаць Зэусу, чаго той дамагаўся, ані думаў. Цяжкія былі цярпеньні, але Промэтэй пацяшаў сябе радасьцямі людзей, а сам усьцяж цярпеў. Але ўрэшце знайшоўся магутны волат — ягоны і людзей староньнік, — які разьбіў Промэтэевы аковы.

Промэтэізм — самаахвярная барацьба за культуру й сьветлае шчасьце беларускага народу—ёсьць у нас зьявішча пэўнае, сьцьверджанае. Пашыраньне і паглыбляньне ідэі Промэтэізму— так-жа факт ясны і канкрэтны. Доказам гэтага прадусім нашы песьняры-паэты. Доказам гэтага так-жа паэт свайго роду: сьпявак-мастак М. Забэйда. На беларускім сьпявачым Алімпе ён першы сапраўды адыграў роль Промэтэя: ён, ня гледзячы на закляцьці даўнейшых і сучасных варожых нам калдуноў і варажбітоў, здабыў ключ да беларускіх народных песьняў, і адчыніў народу да іх доступ, здабыў той сакрэтны агонь, якім умее так асьвяціць і разагрэць народную душу, што яна, калі нават дагэтуль і спала, дык кідае свой сон, будзіцца да глыбейшага, сьведамага жыцьця, бача сваю мінуўшчыну, знаходзіць сябе самую і станавіцца на свой далейшы гістарычны, ужо нацыянальны, творча-культурны шлях.

Лёс Промэтэя тасуецца да М. Забэйды нават і ў дэталях. Праўда, каршун у даслоўным значэньні не выядае яму печаньняў, але за адабраны ад чужых багоў сакрэтны агонь, які дае доступ да беларускай народнай душы і які гэтак магутна накіроўвае гэту душу на яе — праврваны гісторыяй,—сьведамы нацыянальны шлях, як-жа многа беларускі Промэтэй мусіць зносіць рознага роду жыцьцёвых труднасьцяў! Аднак, чуючы прызваньне карыстаць з свайго сакрэтнага доступу да скарбаў беларускай песьні і чуючы прызваньне гэтымі скарбамі, гэным нябесным агнём, які носе ў сваім сэрцы, надзяляць беларускі народ, прызваньне гэта сваё ён спаўняе пагеройску.

У чым жа сутнасьць прызваньня таленту М. Забэйды на высокім беларускім Алімпе? У тым, што ён адчуў і зразумеў у беларускай песьні беларускую народную стыхію і выконваючы яе, як сьпявак-мастак, раскрывае яе арыгінальную красу, узносіць яе на п'едэстал культуры і паказвае яе ўсяму сьвету. З беларускай песьні наш М. З. дабывае праўдзівую народную душу. Тое ўсё, што вякамі накладалася ў душы нашага народу: яго боль, сум, трывога, радасьць, надзейныя лятуценьні, — сьпявак наш памастацку адтварае з дзіўнаю дакладнасьцю і з ня менш дзіўнаю — беларускаю характэрнасьцю. Ён пяе сваім лірычным, шчыра-сардэчным голасам, і пяянае перажывае, а дзеля гэтага ён пяе ня сам, а праз яго казаў-бы пяе народ беларускі. Беларускія сяляне і сялянкі, пачуўшы сваю народную песьню ў выкананьні М. З. з пліткаў патэфону, пачуўшы яе так цудоўна прыгожай, даслоўна плачуць шчыраю сьлязою. Так, хто ўважна й умела паслухае беларускай Забэйдавай песьні, той перажывае з народам яго салодкае і горкае жыцьцё, выражанае ў мастацкай форме У гэтым найбольшая сіла яго таленту і найбольшая заслуга прад народам.

І гэткага роду талент і прызваньне, як у М. Забэйды, гэта на беларускім культурным небасхіле нешта сусім арыгінальнае і новае. Як гэткі, ён першы ў беларускім жыцьці ў Рэчыпаспалітай Польскай і першы ў тым-жа беларускім жыцьці і ў БССР. У гэтай апошняй, у некаторых сьвятлейшых мамэнтах яе існаваньня на грунце беларускай песьні і музыкі зроблена шмат, але савецкія беларускія мастакі, будучы ўсьцяж пад дыктатурай ня толькі палітычнай, але і культурнай марксіцка-матар'ялістычнага догматызму, ніколі ня мелі магчымасьці спрабаваць сваіх сіл у народнай стыхіі беларускай песьні, праняцца гэтай стыхіяй і выявіць яе красу, якая ня мае ніякіх „службовых“ адносінаў да савецкай дыктатуры пралетарыяту. Паход-жа апошнім часам у БССР на беларускую культуру, паход самы рашучы, аканчальна падцінае там крыльлі беларускаму мастацкаму творству агулам і такому-ж творству ў галіне беларускай песьні і музыкі.

Словам, Забэйда ў нас — гэта рэдкая асаблівасьць. Слушна аб ім кажа Р. Шырма:

„Толькі такі мастак-артыст, як Забэйда-Суміцкі, патрапіў вывясьці беларускую народную песьню ў шырокі культурны сьвет. Яму першаму належыць чэсьць і ў перадачы гэтых песень праз грамафонныя плíткі для шырокага карыстаньня ў краі і заграніцай“. *(„Калосьсе“ № 2 (11), 37).*

М. Забэйда — па мойму — павінен такім чынам асаблівую ўвагу зьвярнуць прадусім на беларускую народную песьню. Чаму? a) Сусьветная сьпявачая культура так багатая, што калі для яе выключна не пасьвяціцца М. Забэйда, балючай шкоды ня будзе. b) Новая беларуская сьпявача-музычная культура, якая цяпер толькі *in statu fieri,* у пачаткавай стадыі тварэньня, на Алімпе якой яўнае прызваньне М. Забэйды, калі-б ёй ён не па-

сьвяціўся больш, як чаму іншаму, мела-б сапраўды вялікую страту. с) М. Забэйда шмат ужо даў, і шмат можа яшчэ даць новай беларускай культуры, а праз яе можа шмат новага і арыгінальнага ўнесьці ў скарбніцу культуры агульна-людзкай.

* * *

На заканчэньне яшчэ некалькі кароткіх уваг. Астаецца пажадаць: а) каб М. З. не пераставаў далей працаваць над беларускай песьняй і пяяў яе пры кожнай магчымай нагодзе, нясучы яе чары ў беларускі народ і на ўвесь сьвет; b) каб прымаў самае блізкае ўчасьце пры гармонізацыі і апрацоўцы беларускай песьні мастакамі-музыкантамі, якія часта ня маюць належнага адчуцьця беларускай стыхіі; с) каб не агранічыўся 10-цю беларускімі песьнямі, якія ён ужо насьпяваў на грамафонныя пліткі, а каб у гэтым кірунку зрабіў яшчэ больш, каб маглі чуць Забэйдавую беларускую песьню як найшырэйшыя сялянскія масы; d) каб студыяваў беларускі народны фольклёр, прадусім у яго галіне песьні, а так-жа каб не закідаў студыяў і агулам аб Беларусі. Асабістая культура М. Забэйды і яго далейшая над сабой праца, чаго ён ніколі не забываецца, памагае яму ў яго мастацкай працы агулам, а глыбейшае пазнаньне беларускага народу і беларускай культуры дасьць яму магчымасьць лягчэй рабіць далейшыя поступы ў галіне беларускай песьні; е) з боку-ж беларускага грамадзянства мастаку нашаму належыцца поўнае прызнаньне і ўсякае магчымае, а прадусім маральнае, падтрыманьне. А гэта ўсё праз увагу на тое культурна-мастацкае багацьце беларускай народнай песьні і на тое, што з яе мастак наш можа выдабыць і даць сучаснай новай нацыянальнай беларускай культуры. Бо вось што кажа аб песьні народнай Вялікі Адам Міцкевіч:

„O wieści gminna! Ty arko przymierza
Między dawnemi i młodszemi laty:
W tobie lud składa broń swego rycerza,
Swych myśli przędzę i swych uczuć kwiaty.

Arko! Tyś żadnym niezłamana ciosem,
Pòki cię własny twój lud nie znieważy;
O pieśni gminna, ty stoisz na straży
Narodowego pamiątek kościoła...

Płomień rozgryzie malowane dzieje,
Skarby mieczowi spustoszą złodzieje:
Pieśń ujdzie cało!...“

Др. Тамаш Грыб

У другой палавіне студня месяца лётам маланкі абляцела Вільню сумная вестка: у далёкай чужыне, у дымнай Празе, сталіцы братняга нам чэскага народу, памёр беларускі заслужаны грамадзкі і культурны дзеяч, др. Тамаш Грыб. У сіле веку, меў толькі скончаных 42 гады, др. Тамаш Грыб ня вытрымаў цяжкіх камплікацыяў неўшанаванай хваробы грыпы і разстаўся з намі на векі.

У асобе д-ра Грыба Беларускі народ страціў аднаго з лепшых, культурна-грамадзкіх дзеячоў, палкага патрыёту і барацьбіта за лепшую долю народнае справы.

Радзіўся др. Т. Грыб 7.III.1895 г. ў Палянах, каля Нестанішак, Сьвянцянскага павету, у беднай беларускай сялянскай сям'і. Апынуўшыся, будучы яшчэ маладым хлапцом, у Пецярбурзе, дзе вучыўся нікаторы час у псыхо-нэўролёгічным інстытуце,—заразжа пачаў утрымліваць зносіны з беларускай Пецярбурскай калёніяй, жыцьцю якой патронаваў тады, і быў духовым кіраўніком піонэр беларускага адраджэнскага руху, сьветлай памяці прафэсар Браніслаў Эпімах-Шыпіла († 1934). Аб гэтым прафэсару, прадстаўляючы яго заслугі перад беларускім народам, і праектуючы выданьне зборніка прысьвячанага яго памяці, між іншым др. Грыб піша так: „гэта быў запраўдны духовы правадыр беларускай інтэлігенцыі, падрастаючай моладзі — студэнцтва... Я асабіста ведаю тое, што Браніслаў Эпімах-Шыпіла быў вялікі апостал, прарок беларускага нацыянальнага адраджэньня, які асабістым стыкам, у асабістай размове распаліваў у сэрцах полымя любові да роднага краю"... (Пісьмо з дн. 12.I 1935 г. да інж. А Клімовіча). Бязспрэчна, не бяз уплыву праф. Бр. Эпімаха-Шыпілы фармавалася нацыянальная душа д-ра Грыба, яго гарачы патрыятызм, яго шырокія грамадзкія заінтэрэсаваньні і актыўнае становішча да беларускага публічнага жыцьця. У далейшым жыцьці мы бачым нябожчыка з такімі-ж позытыўнымі якасьцямі характару. — Др. Т. Грыб у 1917 г. зьяўляецца ўчасьнікам,—як дэлегат ад беларускіх жаўнераў з фронту (каля Рыгі),— Усебеларускага Кангрэсу ў Менску, на якім выбіраецца ў выканаўчыя органы Кангрэсу (сяброўства ў Радзе Беларускай Народнай Рэспублікі). У студні 1918 г. быў на 3-цім Усерасійскім Зьезьдзе Саветаў, на якім абгаварывалася пытаньне аб падпісаньні Берасьцейскага міру; др. Т. Грыб, як старшыня фракцыі беларускіх сацыялістаў, выступіў на зьезьдзе з дэкларацыяй, у якой востра пратэставаў проці запраектаванага падзелу Беларусі, таксама проці разгону Першага Усебеларускага Зьезду, на якім прагалошана было права Беларускага народу на самаазначэньне і створана першая беларуская народная ўлада (весткі аб

прысутнасьці Грыба на 3-цім Усерас. Зьезьдзе Саветаў і яго на ім становішчы—узяў з успомненага пісьма да інж. Клімовіча).

Ад 1922 г. Т. Грыб знаходзіцца ў Празе Чэскай, дзе разгартае ў меру сваіх сіл і магчымасьцяў беларускую грамадзкую і культурную працу, працуе ў Беларускай Радзе, у Беларускім Культурным Т-ве ім. Скарыны, у Аб'еднаньні Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў, ад 1934 г. у Беларускім Загранічным Архіве, як яго кіраўнік (па сьмерці праф. Вяршыніна). Апрача таго, разгартае шырокую прэсавую дзейнасьць — знаходзіцца ў кантакце з краёвым, чэхаславацкім, і загранічным друкам і інфармуе яго аб беларускіх справах; утрымлівае кантакт і супрацоўніцтва з асяродкамі беларускага культурнага і грамадзкага жыцьця, — перадусім-жа з Вільняй, куды лятуцеў пераехаць з Прагі на сталае жыцьцё. Быў і нашым супрацоўнікам „Калосься".

У Празе, побач з беларускай грамадзкай працай, у няспрыяючых умовах матарыяльнага характару здабываў далейшую асьвету: скончыў філёзофічны факультэт чэскага унівэрсытэту з тытулам доктара філёзофіі.

Усе, хто знаў Нябожчыка, расказваюць аб ім, як аб чалавеку прынцыповым, з вялікімі асабістымі вартасьцямі і грамадзкімі катэгорыямі думаньня, з гарачым патрыятычным беларускім сэрцам і актыўнай паставай да жыцьця. Пахаваны у пражскай крэматорыі 25.I.38.

Чэсьць Яго памяці!

Мгр. Я. Шутовіч

Др. Тамаш Грыб у сьвятле сваіх пісьмаў

(Да характарыстыкі Нябожчыка)

Узноў новая і вялікая страта для беларускага адраджэнскага руху!.. Памёр у Празе Чэскай адзін з самых шчырых і адданых сыноў Беларускага народу — Тамаш Грыб. Жыў аднэй толькі думкай — працаваць для лепшае будучыны свайго народу. Гэта думка пранізывала ўсё яго жыцьцё, гдзе-б ён ня быў і што-б ён не рабіў, ён ей служыў да самаахвярнасьці і да самага апошняга дня свайго жыцьця.

Я з Тамашом Грыбам спаткаўся толькі адзін раз, у 1922 г., калі ён накіроўваўся ў Прагу Чэскую цераз Рыгу і зайшоў да мяне ў Беларускі Аддзел. І цяпер я ўспамінаю малады твар Нябожчыка, у якім сьвяцілася энэргія, якаясь ветлівасьць злучаная з рашучасьцю; аб ім можна сказаць, што мала пражыў, але многа пережыў і передумаў. Гэта першае і апошняе маё спатканьне з Тамашом Грыбам. Але ў мяне яшчэ асталося некалькі пі-

сьмаў яго, зьмест якіх дужа цікавы і ў якіх яскрава бачыцца дзейная душа Нябожчыка, яго чулае сэрца, якое кожную хвіліну білася для бацькаўшчыны і за бацькаўшчыну. Гэтыя-ж пісьмы сьведчаць, што можа зрабіць кожны ідэёвы і аддаңы працаўнік-беларус, нават калі лёсам жыцьця ён адсунуты далёка ад сваей бацькаўшчыны.

Перапіска паміж Т. Грыбам і мною завязалася ў 1928 г., пасьля таго, як ён скончыў у Празе унівэрсытэт і атрымаў ступень дохтара філёзофіі. Нябожчык зьвярнуўся да мяне, як дырэктара Дзьвінскае беларускае гімназіі, з просьбаю прыняць яго на пасаду настаўніка гімназіі, матывуючы яе так: „Жыву на чужыне, як палітычны эмігрант, займаючыся выключна навуковай працай. Арганізаваў Беларускі навуковы кабінэт у Празе, маючы на мэце навуковы досьлед і вывучаньне Беларусі; распачаў шэраг навуковых працаў. Але ў апошні час значна падупала маё здароўе, дахтары радзяць зьмену клімату. З другога боку — любоў да беларускага народу цягне мяне на родныя палеткі"... (пісьмо ад 22.VIII.1928 г.). Жаданьне Т. Грыба ня зьдзейсьнілася, бо прыймо на дзяржаўную службу чужаземцаў у гэты час у Латвіі было немагчымым. У сваім чарговым пісьме ад 7.X.1928 г. паведамляе мяне, на адмову аб пасадзе, што ён не падае духам і больш падрабязна інфармуе мяне аб плянах сваей працы: „А цяпер дазвольце папрасіць Вас, паважаны Сяргей Пятровіч, аб аднэй маленькай інфармацыі: у Вас, здаецца, існуе гурток, ці то таварыства, добра ня ведаю, які займаецца краезнаўствам.*) Справа ў тым, што я тут у Празе, як Вам ужо ведама, заснаваў Беларускі навуковы кабінэт, як прыватную навукова-дасьледчую установу. Галоўная мэта — навуковы досьлед і вывучаньне ўсіх асаблівасьцяў Беларускага народу, як у гістарычнай мінуўшчыне, гэтак і ў цяпершчыне, асаблівую зьвяртаючы ўвагу на тыя прычыны, якія спрыялі ўзьніку тых ці іншых асаблівасьцяў, іх разьвіцьцю або заняпаду. Скажу Вам зусім шчыра: я працую над пытаньнем *нацыянальнае тыпалёгіі*, ці йнакш кажучы — *псыхалёгіі народаў*. Канкрэтна — якая ёсьць псыхалёгія Беларускага народу? Чым характарызуецца ці адрозьніваецца беларус ад паляка, латыша, вялікаруса, ліцьвіна ды інш., у чым выяўляюцца характэрныя асаблівасьці самаістай яго індывідуальнасьці? Гэтак сама: беларус-каталік і беларус-праваслаўны, беларускі селянін і беларускі работнік, інтэлігент,— жыхар вёскі, мястэчка і места. Шэраг іншых пытаньняў. Дык вось, калі ў Вас ёсьць краезнаўчы гурток, які, пэўна-ж, займаецца вывучаньнем асаблівасьцяў Беларускага народу (пераважна мабыць з пункту гледжаньня асаблівасьцяў мовы, казкі, песьні, прыказкі), то ці нельга было-б скласьці супольную праграму і вывучаньне па аднаму акрэсьленаму пляну, каб пасьля сабраны ма-

*) Відаць Т. Грыб меў тут на ўвазе вучнёўскі гурток пры гімназіі дзеля збору беларускага фольклёру ў Латгаліі.

тарыял можна было ў адпаведны навуковы спосаб выкарыстаць для агульнае характарыстыкі асаблівасьцяў Беларускага народу"...

Трэба адзначыць, што больш цеснага кантакту ў супрацоўніцтве паводле пляну Т. Грыба нам не ўдалося ўстанавіць, бо мне было цяжка, займаючы адказную пасаду дырэктара, адначасна займацца і чыста навуковай працай. Але ад імя гімназіі яму акуратна пасылаўся выхадзіўшы ў тыя часы пад маім кіраўніцтвам вучнёўскі часапіс „Школьная Праца". І вось на гэта атрымліваю прывітальнае пісьмо з новым годам ад 1.I.1930 г., у якім Т. Грыб у дужа ветлівых словах дае ацэнку вучнёўскага часапісу: „Як міла выглядае рукапісны часапіс Вашае гімназіі! Колькі шчырага пачуцьця і любові да свайго народу! У час магутнага ўздойму тэхнікі, друкаванага слова, і раптам — рукапісны часапіс Дзьвінскай беларускай дзяржаўнай гімназіі, часапіс прысьвячаны народнае творчасьці. Я шмат каму паказваю гэты адзіны часапіс у беларускай мове за апошнія гады. Сабрана шэраг песьняў і казак — навіна ў славянскай этнаграфіі, шэраг асаблівасьцяў беларускае мовы, над чым спыніцца не адзін філёлёг. Ад усей шчырасьці жадаю Вам далейшае працы ў гэтым напрамку, карыснае і вельмі каштоўнае працы! З часам, а гэта мабыць незадоўга, будзеце мець цікавейшы і каштоўнейшы зборнік народнае творчасьці беларусаў Латгаліі, што разам з іншымі нарысамі складзе першую манаграфічную працу аб беларусах у Латвіі. Я веру — Вы гэта зробіце!"

І сапраўды, гэтыя бадзёрыя словы і высокая ацэнка этнаграфічнай працы гімназіі з боку Т. Грыба, як навуковай сілы і як грамадзкага дзеяча, прыдалі больш ахвоты і энэргіі ў свой час і беларускаму вучыцельству і вучням у працы над зьбіраньнем народнай творчасьці Латгальскага беларуса. Асабіста і я па выхадзе сваім на амэрытуру (пэнсію) ў 1932 г. аддаю шмат часу на сыстэматызацыю ўжо сабранага этнаграфічнага матарыялу, а таксама раблю ў летнія часы этнаграфічныя экскурсіі для запісу новых твораў беларускай народнай паэзіі. Цяпер ужо маецца сабраных па Латгаліі 1033 беларускіх народных твораў. У гэтым-жа пісьме Т. Грыб пасылае прывітаньне аўтарцы казкі —сцэнічнага твору „На Полацкім Замчышчы", Вользе Сахаравай, і піша: „Гэты твор уваскрашае мінуўшчыну нашу. Гэта ёсьць першая спроба ў маладой беларускай літаратуры — даць для дзіцячага тэатру сцэнічны твор з гістарычнае мінуўшчыны Беларусі, у якім сымболіка так паэтычна пераплятаецца з рэальнасьцю. Няхай толькі на гэтым ня спыняецца, няхай далей працуе!" Так Т. Грыб умеў кожнаму сказаць ласкавае слова, кожнага падахвоціць да працы!

І хоць Нябожчык ня часта пісаў, але падрабязна. „Даўно ўжо я Вам пісаў, проста аж сорамна прызнацца,—піша Т. Грыб у сваім пісьме ад 25.I.1932 г. — А так многа аб чым хацелася-б з Вамі пагутарыць, дзе што абмяркаваць, аб нашых справах беларускіх пасумаваць, бо мала, вельмі-ж мала ёсьць пацяшаюча-

га ў нашых цяжкіх і нават скрутных абставінах. Апошнія два гады я працаваў ў Славянскай бібліятэцы, дзе, побач з аддзеламі іншых славянскіх народаў, арганізаваны і беларускі аддзел. Сабрана значная колькасьць матарыялаў; амаль усе выданьні за апошнія два дзесяцігодзьдзі, якія так або інакш датычаць Беларусі і Беларускага народу. У значнай меры апрацавана і беларуская бібліяграфія: дакладная бібліяграфія ўсіх галін беларусазнаўства. Славянскі інстытут у Празе гэтай справай цікавіцца і можа з часам выдасьць журнал. Мая праца ў славянскай бібліятэцы была працягам папярэдняе працы ў Беларускім навуковым кабінэце. Цяпер працую ў Беларускім Загранічным Архіве. Прыводжу ў парадак архіўныя матарыялы і папаўняю сваю бібліяграфію беларусазнаўства".

І ўсё-ж-такі, ня гледзячы на бязупынную працу, Тамаша Грыба вабяць і цягнуць да сябе родныя палеткі... Сумна яму на чужыне... Вось з якім вялікім пачуцьцём любячага сына сваей бацькаўшчыны ён далей піша ў гэтым-жа пісьме: „Разам з тым раблю захады, каб вярнуцца да хаты, на родныя палеткі беларускае зямлі. Вы і ўявіць сабе ня можаце, як цісьне і гняце адарванасьць ад роднага краю, як хочацца пабачыць свае родныя вёскі, свой родны беларускі краявід. Цягне да хаты... Грызе туга... А Вы мабыць ведаеце, што мая родная вёска знаходзіцца ў Віленшчыне, дзе я ня быў ужо ад Каляд 1918 году. Так хутка бяжыць час... Здаецца і нядаўна гэта было, як пасьля доўгіх гадоў разлукі я наведаў сваіх старых бацькоў. Чакаюць яны мяне і цяпер. Жадаюць бачыць мяне хоць раз яшчэ перад немінучым адыходам у вялікую дарогу вечнасьці... А хіба-ж і я не жадаю бачыцца з сваімі старымі бацькамі?.. Ды ня толькі жадаю, але і адчуваю маральную павіннасьць пабачыць іх, суцешыць іх старыя гады. Вось чаму я рашыў зьвярнуцца ў Польскі кансулят у Празе, каб выдалі мне пашпарт грамадзяніна Польскае дзяржавы. Калі выдадуць, паеду ў Вільню і далей у сваю родную вёску. А там... ня ведаю, што далей будзе. Якбы там ня было, але я ніколі, ні пры якіх абставінах не перастану жыць і працаваць для дабра свайго народу!"

Каля пяці год я не атрымоўваў ад Тамаша Грыба вестак, але заўсёды яму пасылаў, што надрукавана было ў беларускай мове ў Латвіі. Аж урэшце ў апошнім пісьме датаваным 6.IV. 1937 г. Нябожчык паведамляе мяне аб цяжкім стане свайго здароўя: „Занядужэў, моцна занядужэў і ўжо трэці месяц ляжу ў бальніцы. Апошнімі днямі пачынаю ўжо лепей сябе адчуваць. Спадзяюся, што ў канцы гэтага месяца выйду з бальніцы і можа і ня зусім здаровы — на гэта ўжо ня маю надзеі, — але настолькі ўжо, каб магчы хоць трошачкі рухацца і працаваць"...

Я адразу-ж напісаў яму, прасіў яго хоць адкрыткамі паведамляць мяне аб стане свайго здароўя, але ўжо нічога не атрымаў. Відаць хворасьць моцна ўчапілася за яго, прыкавала яго да ло-

жака, і ў неспадзеўкі да Рыгі дакацілася вестка: Тамаша Грыба няма.

Ня зьдзейсьніліся яго лятуценьні аб пераезьдзе ў сваю родную краіну, не пабачыў ён і сваіх бацькоў, спынілася яго карысная культурная, навуковая і грамадзкая праца, перастала біцца чыстае сэрца аднаго з лепшых беларускіх працаўнікоў і інтэлігентаў! Сумна, дужа сумна стала мне, як і кожнаму, хто хоць крыху ведаў Нябожчыка. Пачаў я перачытываць яго пісьмы да мяне і так шмат знайшоў у іх цікавага, як з боку агульна-нацыянальнага, так і для характарыстыкі надзвычайна сьветлай істоты Тамаша Грыба, што рашыў пазнаёміць з імі чытачоў „Калосься“.

Хай гэта будзе невялічкім вяночкам на далёкую ад нас магілу-урну Тамаша Грыба, хай яму будзе лёгкай братняя чэская зямелька і хай памятка аб ім вечна жыве сярод беларускага грамадзянства і асабліва сярод беларускай моладзі!

С. Сахараў

Беларускі канцэрт 4.III.1938

Хору Шырмы і А. Чарняўскай-Орсы

Няма, напэўна, у Вільні нікога, хто любіў-бы музыку і нічога ня чуў аб беларускім Хоры Рыгора Шырмы; няма нікога, хто раз паслухаўшы гэты Хор, не захацеўбы яшчэ і яшчэ слухаць. Што-ж дзіўнага, што ня трэба было вялікай рэклямы, афішаў ці абвестак, каб уся музыкальная Вільня даведалася, што ў нядзелю 4-га сакавіка Хор Шырмы і маладая сьпявачка Аўгеньня Чарняўская-Орса пяюць у унівэрсытэцкай залі Сьнядэцкіх. Перадавалі аб гэтым адзін аднаму знаёмыя на вуліцах, студэнты і вучні на лекцыях — і перад канцэртам вялізная заля Сьнядэцкіх была поўнай. Беларуская мова панавала ў залі і карыдорах, але нямала прышло й расейцаў, палякоў, жыдоў. Пераважала моладзь — арганізавалі канцэрт беларускія студэнты,—было аднак і шмат прадстаўнікоў старэйшага грамадзянства, духавенства, праваслаўнага і каталіцкага, прыйшлі паслухаць сваю песьню і сяляне, прыехаўшыя ў Вільню на традыцыйны кірмаш.

Пачаў пяяць Хор. Перад слухачамі адкрывалася ўся магутная глыбіня, незямная прыгожасьць, замкнутая ў простай, прымітыўнай часамі, мэлёдыі беларускай песьні. Шырма зглыбіў, зразумеў вартасьць гэтай песьні і не *памагае,* але *змушае* кожнага адчуць яе хараство.

Хор Шырмы ня сьпіць, ён усьцяж працуе, дасканаліцца, шукае новых песьняў, новых адценкаў іх выкананьня. На апошнім канцэрце, як і на кожным папярэднім, шмат было песьняў новых, няведамых яшчэ шырокай публіцы, сьвежа гарманізаваных такімі мастакамі, як Грэчанінаў, Кошыц, Галкоўскі. Сьведчыць гэта вымоўна аб працавітасьці Хору і яго кіраўніка.

Трудна сказаць, якая песьня падабалася найбольш: усе былі выкананы вельмі добра, усе выклікалі шчырыя воклескі слухачоў.

Хор Шырмы пяе народныя песьні ў мастацкай апрацоўцы розных,—беларускіх, расейскіх, украінскіх—композытараў, але песьні гэтыя ня губляюць свайго народнага, беларускага характару. Заслуга гэта ня толькі композытараў, працуючых над беларускай песьняй, але і рэгента Хору — Р. Шырмы, які беларускую песьню знае, разумее і любіць. Як-жа бліжэйшае духу народнай музыкі выкананьне Хору Шырмы ад выкананьня рознага роду „людовых зэсполаў," выступаючых часам у радыё! Народная песьня, асабліва беларуская, ня церпіць вульгарнасьці, як ня церпіць яе сапраўднае хараство, сапраўднае мастацтва. Шырма гэта ведае, гэтага трымаецца, таму і Хор яго заўсёды стаіць на мастацкай вышыні.

Маладая сьпявачка Аўгеньня Чарняўская-Орса, няведамая дагэтуль у Вільні, паказала сябе здольнай артысткай. Сьвежы, моцны і мяккі голас варожыць ёй слаўную будучыню.

У першай частцы канцэрту артыстка выканала некалькі арыяў Гэндэля, Вэрдi, Монюшкі, Бойто. Выкананьне здавалася можа крыху „школьным," артыстка не пазваляла сабе выйсьці за рамкі чыстага „bel canto" нават у найбольш патэтычных мейсцах выконываных твораў. Гэтая аднак „строгасьць" выкананьня бароніць маладую артыстку перад пакусай танных эфэктаў і фальшывага патосу, памагае ёй заўсёды захоўваць шляхотную прастату і прыгожую павагу музыкальнага выражэньня.

У другой частцы канцэрту А. Чарняўская-Орса пяяла народныя песьні ў апрацоўцы праф. Галкоўскага і, на заканчэньне, „Маладую Беларусь" таго-ж композытара на словы Я. Купалы. Народныя песьні ўдаліся артыстцы менш, выкананьне іх не стаяла на той вышыні, якой ад артысткі можна было-б спадзявацца, яна іх пяяць яшчэ не навучылася (у консэрваторыі напэўна гэтага ня вучаць), але знаньне беларускай мовы і ўроджаная музыкальнасьць памогуць ёй і ў гэтай галіне музыкі асягнуць адпаведную вышыню. Чакаем нецярпліва новага канцэрту.

В. Багдановіч

„Знахар"

Заціраньне праяў беларускага жыцьця і ўсіх сьлядоў наяўнасьці беларусаў, якое здаўна праводзіцца нікаторымі дзейнікамі, у нашым краі, пад агульным назовам рэгіоналізму, узбагацілася новай пазыцыяй у галіне кінэматографіі. Гэтым новым укладам ёсьць фільм „Знахар" паводле раману Далэнгі-Мастовіча, з тым-жа самым загалоўкам. Перадаваць зьмест ані раману, ані фільму ў гэтым месцы няварта, ён нас найменш цяпер эмоцыянуе, даволі, што ў рамане Мастовіча шмат акцыі адбываецца ў беларускай абстаноўцы — недзе каля млыну Пракопа Шапеля ў беларускай вёсцы ў Браслаўшчыне.

Трэба запісаць на дабро аўтара, што ён, як на сучаснасьць, чалавек адважны: карыстае із слоў, як „беларусы," „беларускі" і нават скланяе іх — „беларускага," „беларускаму," „аб беларускім"! — Дае маленечкія няточнасьці, але гэта нічога. Піша ён, што ў беларускай хаце, нармальна бяручы, гавораць дубэльтова: пабеларуску і папольску (староньнік утраквізму). Але гэта яшчэ можна вытрымаць, — як на сярэдняга бэлетрыста ўзровень ненайгоршы. Што-ж датычыць фільму, рэклямаванага, як найвялікшы польскі шлягер, дык тутака спатыкаемся з рэгіоналізмам горшага парадку. Уявіце сабе, што ў беларускай хаце і вёсцы ўсе,

як на заказ, гутараць чысьцюсенькай польскай мовай і з якім яшчэ харошым акцэнтам! Сяляне з Браслаўшчыны так чароўна на экране гавораць папольску, ды яшчэ паміж сабою, што напэўна віленскіх эндэкаў і ім падобных зайздрасьць і сорам за сэрца хапае за іх собскі пранонс. (Не пачуеце — „пане Зыгмуонце"— не, дзе-ж там!). Проста варшаўскай вымовай захапляюць. Гэта, запраўды, надта вялікі крок наперад у разьвіцьці рэгіональнай думкі ў нашым краі!

Прыпомнім сабе адносна нядаўна дэманстраваны таксама фільм польскай прадукцыі „Што ў Вострай сьвеціш Браме," які адтвараў віленскую вуліцу. Ён, гэты фільм, стаяў яшчэ на ніжэйшай ступені рэгіяналістычнай драбіны.

Тамака мы бачылі і чулі віленскіх Казюкоў і Стасюкоў, гаворачых жаргонам Вінцука Маркотнага. Але чалавечая думка не стаіць на месцы. Яна, як той казаў, усьця-ж эволюцыянуе. Вынікам гэтай эволюцыі і зьяўляецца „Знахар." Цікава, што Мастовіч у сваім рамане адзначае месца акцыі — г. з. браслаўскі павет, рэалізатары-ж фільму ідучы за духам часу выкінулі гэта— толькі ў двух мясцох знаходзім топографічныя ўказаньні. На адным з надпісаў гаворыцца аб блізасьці Вільні, і на палатне бачым сялян, каторыя перад абразамі жагнаюцца праваслаўным спосабам.

Паўстае пытаньне, нашто было гэта пакідаць у фільме? Ці ня лепш было-б перанесьці месца дзейнічаньня ў Мазавецкую пушчу ці на Каспровы Верх?

Не пазбаўлена пікантэрыі рэакцыя г. з. шырокай публікі на вышэйпададзеныя недарэчнасьці. Усё ідзе ў парадку, усе з напружаньнем сочаць за разьвіцьцём падзеяў і гульнёй актораў (Юноша-Стэмпоўскі і Баршчэўская). Раптам селянін, каторага праз цэлы час глядзельнікі прыймалі за „rodaka", бо-ж гаварыў у ўрадавай мове, пачынае жагнацца перад абразом у тры пальцы справа налева. На залі констэрнацыя. Згублена пераглядаюцца.

— A bo to wiecie tam gdzieś koło Wilna. No takl właśnie.— Сумна глядзець, як людзі самі сябе абдурываюць. І ня маюць нададатак пачуцьця гумару. Систэматычна кормяць сябе нейкімі хімэрамі. Ня хочуць зразумець існаваньня беларускага народу і адмахіваюцца рукамі і нагамі ад усяго беларускага. Каў-бой з Арызоны з кольтам у руцэ больш зразумелы для гэтых глядзельнікаў, чым Беларус з Браслаўшчыны. Знахар, чалавек загубіўшы сваю памяць, макабрычна прасоўваецца праз цэлы фільм. І запраўды выдаецца, што знахары ўвіхаюцца навакол беларускай душы!.. Ці не зашкодзяць самі сабе?

А. Б—скі.

„Наша Песьня"

Гэтак называецца новы зборнік беларускіх народных песьняў з рэпэртуару шырока ведамага Беларускага Хору Р. Шырмы. У продажы зьявіўся ў пачатку сакавіка сёл.

У нармальных варунках зьявішча гэта здавалася-б быць так звычайным, што аб ім нечага асобна і ўспамінаць: хапіла-б гэта адзначыць нейдзе на вокладцы, у рубрыцы „прысланыя" і ўсё.

Ня тое ў нас Беларусаў, у Вільні, у 1938 годзе. У нашых варунках выхад у сьвет кожнай найменшай кніжачкі ёсьць здарэньнем вартым увагі з тае простае прычыны, што: 1. няма ў нас заможных людзей, якія самі маглі-б сыстэматычна апекавацца беларускім выдавецтвам, 2. беларускія арганізацыі, якія выдавецтвам гэтым апекаваліся, паўтара году ўжо як зачынены адміністрацыйнымі ўладамі, 3. з Фонду Нацыянальнай Культуры, з якога ўспамагаюцца выдавецтвы польскія, беларускія выдавецтвы нічога не атрымоўвуюць... У гэтых варунках, паўтараю, кожная новая беларуская кніжка гэта важнае здарэньне.

З тым большым задаваленьнем трэба сустрэць выдавецтва з галіны беларускага народнага сьпеву: нікому не сакрэт, як вялікія сягоньня выкідаюцца сродкі, каб гэту песьню ад беларусаў „пазычыць" і з якой ахвярнасьцю супроць гэтага самі беларусы працуюць, каб сваю песьню ўтрымаць і пераказаць пакаленьню наступнаму. Гэтай ахвярнасьці трэба быць удзячным і за новы зборнік п. н. „Наша песьня".

Ёсьць гэта зборнік 15-цёх народных беларускіх песьняў у апрацаваньні на 4-галосы мяшаны хор такімі знаўцамі беларускай песьні, як Грэчанінаў, Галкоўскі, Рагоўскі і інш. Усе песьні сабраны з розных беларусамі заселеных абшараў, як Маладэчаншчына, Ваўкавышчына, Пружаншчына, Пастаўшчына й інш. Большасьць гэтых песьняў запісаны самым рэгентам Р. Шырмам і ягоным так-жа стараньням у вялікай меры трэба прыпісаць сам выхад у сьвет гэтага цэннага зборніка.

Вонкавай аздобай зборніка ёсьць вокладка, якую запраектаваў і памастацку выканаў беларускі мастак М. Сяўрук.

Для кожнага, хто цікавіцца багацтвам беларускай народнай песьні, новы зборнік ёсьць вельмі цэнным здабыткам.

А. Клімовіч

Хроніка

— 15.I віленскае гарадзкое старраства спыніла дзейнасьць — на дваццатым годзе існаваньня — Беларускага Нацыянальнага Камітэту, матывуючы сваё рашэньне мамэнтамі „безпечэнства, спокою і пожондку публічнэго". У сувязі з гэтым, у той-жа дзень адбыліся ў памешканьні К-ту, у рэдакцыях часапісаў: „Хрысьціянская Думка", „Самапомач", „Шлях Моладзі", „Калосьсе", „Вядомосьці Бялорускe", „Беларускі Летапіс" і „Беларуская Борць", а так-жа ў памешканьні старшыні Бел. Нац. Камітэту інж. А. Клімовіча рэвізія, у выніку якой забраны некаторыя рукапісы, лісты, друкі, а ў інж. А. Клімовіча забрана так-жа прыватная машынка да пісаньня. У нашым часапісе апроч рукапісаў, пераважна літаратурных, падчас рэвізіі забрана больш пяцідзесяці кніжак савецкага, менскага выданьня. Кніжкі ў сваім часе рэдакцыя „Калосься" для літаратурна-навуковых мэтаў атрымала ад Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, які з свайго боку атрымаў іх з Менску на варунках узаемнай вымены ад Беларускай Акадэміі Навук; а некаторыя кніжкі рэдакцыя наша атрымала з Менску беспасрэдна—даручыла іх нам польская пошта. З забраных матарыялаў нічога нікому дасюль ня вернена. Прэзыдыюм Бел. Нацыянальнага Камітэту ад рашэньня старасты адклікаўся да ваяводзкіх уладаў. Бяз выніку пазытыўнага. Ваяводзкія ўлады пацьвердзілі становішча старасты... Пасьля гэтага, адміністрацыйныя ўлады прыслалі рашэньне, цалком ліквідуючае Беларускі Нацыянальны Камітэт. І ад гэтага рашэньня зложаны рэкурс вышэйшым адміністрацыйным інстанцыям. Такім чынам найстарэйшая ў Вільні беларуская нацыянальная арганізацыя, маючая вялікія заслугі перад Беларускім народам, знаходзіцца ў стадыі ліквідацыі...

— У студні месяцы мінула сто год ад нарадзінаў дыктатара Літвы і Беларусі, ахвярнага барацьбіта за лепшую долю народаў нашага краю, слаўнага Кастуся Каліноўскага, павешанага царскімі ўладамі ў 1864 г. у Вільні на Лукішках. У літаратуры беларускай найбольш поўна і гістарычна правільна прадстаўлена постаць гэтага слаўнага нашага героя ў працах кс. Адама Станкевіча („Кастусь Каліноўскі, „Мужыцкая Праўда", і ідэя незалежнасьці Беларусі").

— Дня 25-га студня адбыліся ў Празе чэскай, у крэматорыі, пахараны памёршага прадчасна дня 21.I беларускага культурнага і грамадзкага дзеяча, сьв. п. Дра Тамаша Грыба. Падчас пахаранаў прамаўлялі прадстаўнікі ад Беларусаў, Чэхаў, Расейцаў, Украінцаў, Грузінаў, Калмыкоў і інш. Жалобны цывільны цэрэмоніял закончыўся беларускім нацыянальным гімнам „Не пагаснуць зоркі ў небе" — адыграным на арганах. Урачыстыя пахараны зарганізаваў беларускі грамадзкі Камітэт, у складзе: В. Захаркі, інж. В. Русака, дра Я. Ермачэнкі, інж. Барткевіча і інж. А. Калошы.

— У пачатку б. году скончыў Акадэмію Мастацтваў у Рызе гр. Пётра Міррановіч, — Беларус з Прыдруйшчыны.

— 6-га лютага сёл. адбыўся штогодні агульны сход сяброў Беларускага Навуковага Т-ва. Сход пачаўся ўшанаваньнем памяці памёршага ў справаздаўчым годзе сябры Т-ва гр. Івана Цеханоўскага, б. дырэктара беларускае гімназіі ў Наваградку.

Паводле зробленай на сходзе справаздачы, Урад Т-ва адбыў 7 паседжаньняў. З важнейшых выступленьняў Ураду ў справаздачы адзначаны зварот да старшыні Рады Міністраў — з дамаганьнем, каб з дзяржаўнага Фундушу Нацыянальнае Культуры была дадзена дапамога і на беларускую культурную працу. Зварот гэты пазытыўных вынікаў ня даў. — Другая справа, у якой выступіў Урад Т-ва, гэта дамаганьне накіраванае да самаўраду м. Вільні, каб пры пераглядзе назоваў віленскіх вуліц дванаццацём з іх былі дадзены назовы заслужаных сыноў Беларусі (сьпіс імёнаў

быў друкаваны ў „Калосьсі" ў 1937 г.). Вынікі гэтага-выступленьня дагэтуль няведамыя.

Галоўная праца Т-ва, як выявілася з справаздачы, вялася ў Музэйнай Радзе і ў сэкцыях: літаратурна-мастацкай, гістарычнай і языкаведнай. (Справаздачы з дзейнасьці сэкцыяў былі ў „Калосьсі" сваечасова зьмешчаны).

Пасьля справаздачы Ураду і дакладу Рэвізыйнае Камісіі аб праверцы касы і маемасьці Т-ва, сход даў Ураду абсолюторыюм. Далей абгавораны быў плян працы Т-ва на наступны год і выбраны новыя ўлады Т-ва.

— Згодна з справаздачай Музэйнае Рады за 1937 год, у Беларускі Музэй ім. Ів. Луцкевіча прыбылі гэткія новыя рэчы: манэт — 650, у аддзел этнаграфіі — 88 рэчаў, прэгісторыі — 9, разьбы народнае — 2, абразоў і рысункаў — 13, розных іншых — 22, агулам — 784 рэчы. Апрача таго: калекцыя віленскае цэрамікі (кафляў), рукапісы М. Багдановіча, Ул. Жылкі, К. Каганца, копіі актаў судовага працэсу Якуба Коласа ў Віл. Суд. Палаце, старыя рукапісы ад гр. Б. Брэжгі (з Дзьвінску), багатая карэспандэнцыя ў справах вуніі, шмат фатаграфіяў і інш. Экспонаты атрыманы пераважна, як дар. Сваімі экспонатамі Музэй абслужыў дзьве выстаўкі: выстаўку народнага мастацтва ў Варшаве і выстаўку Марыёлёгічную ў Вільні.— Агледзілі Музэй у працягу 1937 году 4569 асобаў, у тым ліку 110 экскурсіяў.

На пачатку 1938 г. Беларускі Музэй узбагаціўся цэннымі экспанатамі ў галіне іконаў і разьбы — народнае і мастацкае. Мастацкая разьба паходзіць з XVII стагодзьдзя. Адзін з экспонатаў гэтае групы мае подпіс мастака-разьбяра — Казімера Круповіча (1697 году).

Лічба кніг у Бібліятэцы пры Музэі павялічылася за год на 309 тамоў. У бібліятэцы значна пасунулася праца над укладаньнем рачовага каталёгу.

— Віленскі Апэляцыйны Суд 9-га лютага пакараў нашага супрацоўніка Максіма Танка 6-ці месячным вастрогам за сканфіскаваны летась зборнік ягоных твораў „На этапах". Такой-жа карай суд аблажыў і выдаўца зборніка, гр. Труцьку. Абодва засуджаныя адклікаюцца ў Найвышэйшы Суд, як інстанцыю касацыйную. Танк і Труцька ў першай судовай інстанцыі былі апраўданы.

— Слаўны наш сьпявак Міхал Забэйда-Суміцкі ў лютым месяцы і ў першай палавіне сакавіка аб'ехаў некаторыя гарады нашага краю — Ваўкавыск, Слонім, Баранавічы, Навагрудак, Несьвеж, — дзе выступаў з канцэртамі, у праграме якіх былі і беларускія народныя песьні.

— Грам. Пётра Сяргеевіч, ведамы ў краю беларускі мастак, у канцы лютага адбыў падарож у Рым. Пры гэтай нагодзе пабываў у Вэнэцыі, Флёрэнцыі, Вене і ў іншых местах. Мэта падарожы мастацка-турыстычна-навуковая.

— У Варшаве беларуская калёнія ўрэшце зарганізавалася ў Асьветнае Т-ва Беларусаў у Варшаве. Т-ва гэтае ўжо прыступіла да працы. (Адрыс Т-ва: Warszawa Świętokrzyska 9—18).

— 4-га сакавіка адбыўся ў Вільні арганізаваны Беларускім Студэнцкім Саюзам канцэрт беларускай песьні. Рэцэнзію на канцэрт пяра праф. В. Багдановіча зьмяшчаем на іншым месцы. Тут адзначаем яшчэ дужа эфэктоўнае выступленьне, на заканчэньне канцэрту, беларускіх танцораў, на чале з мграм. Я. Хворастам, якія выканалі беларускія народныя танцы „Лявоніху" і „Чарота" ў мастацкім афармленьні мгра Я. Хвораста.

— Інстытут геолёгіі і гідрагеолёгіі Акадэміі Навук БССР выканаў новыя працы ў галіне вывучэньня геолёгічнай будовы БССР. — У Глускім раёне выкрыта возера горкасалёных водаў. Дзеля іх вывучэньня заложана буровая студня. У Камарынскім раёне знойдзены два мэтэорыты, з якіх адзін важа 288 клг.— У Гарадоцкім раёне выкрыта і вывучана значная магнітная аномалія, каторая цягнецца шырокай паласой на 55 клм., на поўнач ад г. Віцебска. Яна відавочна паказвае на прысутнасьць тут нетраў магнітнай жалезнай руды. Із карысных выкапняў вялікую ўвагу інстытуту звварачываюць вівіяніты — вартасны ма-

тарыял для гнаеньня зямлі. Вывучаныя інстытутам падземныя воды БССР, а так-жа зроблены захады ў справе зарганізаваньня геолёгічнага музэю.

— Выстаўка „БССР за 20 год", якая адбылася ўвосені м. г., выклікала заінтэрэсаваньне да самадзейнага мастацкага творства. — У апошнім часе ў БССР выявілася каля 40 талентных мастакоў — самавукаў, што з удачай працуюць над мастацкімі вырабамі з дрэва (мазаіка, інкрустацыя, разьба),

— У Рэчыцкім раёне БССР вучань сярэдняй школы, пятнаццацігадовы сялянскі хлопчык, Васіль Курыловіч ад раньняга дзяцінства праяўляе здольнасьці да рысаваньня; займаецца ён таксама і скульптурай. Гэты здольны мастак-самавук многа мае нарысаваных абразоў і скульптураў.

— Газэта „Сов. Белоруссія" (№ 37, 15.II.38) сьцьвярджае факт вялікага заінтэрэсаваньня грамадзянства ў Беларусі музэйнай справай, гістарычнымі памятнікамі і матарыяламі. — Толькі за 206 дзён 1937 г. Менскі гістарычны музэй наведала 23.429 чалавек. Газэта падае далей, што гістарычныя музэі ў БССР знаходзяцца ў вельмі кепскіх варунках, дзеля чаго колькасьць іх з году ў год зьмяншаецца. Некалькі год таму было ў БССР 15 музэяў, цяпер асталося толькі сем. Аршанскі, Рэчыцкі, Слуцкі і інш. музэі аканчальна развалены, многія экспонаты прапалі. — За адносна кароткі час закрыты Полацкі, Бабруйскі і Тураўскі музэі. З г. зв. цэнтральных музэяў існуюць яшчэ чатыры: Менскі, Гомельскі, Віцебскі і Магілеўскі, у каторых знаходзіцца многа вельмі вартасных помнікаў старасьведчыны.—У Камісарыяце Асьветы БССР, які кіруе музэямі, паводле газэты, „аб тым, што робіцца нават у гэтых цэнтральных музэях, якія іх багацьці, хто там працуе, — ня знаюць, не інтэрэсуюцца". Напр. Менскі гістарычны музэй, з прычыны нястачы выгоднага памешканьня, з усіх матарыялаў выстаўлены толькі 20 прац., усе іншыя звалены ў сырыя, няпрыгодныя для іх перахаваньня пакоі... Паводле газэты дрэнны стан музэйнай справы выкліканы ня толькі ўспомненымі прычынамі, але так-жа і адсутнасьцю працаўнікоў-спэцыялістаў, якія ня хочаць працаваць у музэях, бо... не забясьпечываюцца адпаведна з матарыяльнай стараны.

— 5-га лютага скончыўся ўсебеларускі (Сав. Беларусь) конкурс на лепшыя музыкальныя творы кампазытараў і пісьменьнікаў БССР. На конкурс прыслана ўсяго 42 творы, з якіх журы прызнала лепшымі і прэміравала: тры маршы для духовага аркестру — кампазытараў Залатарова, Іванова і Рыбкіна, па адной масавай песьні — Аладава, Чуркіна, Цікоцкага, Любана і Іванова. З пісьменьнікаў прэміраваны за тэксты песень — Хведаровіч.

— Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі выдала сёлета тыражом 8.000 экзэмпляраў зборнік „Беларускія народныя і рэвалюцыйныя песьні" (бач. 240). У зборніку песьні для харавога і солёвага выкананьня. Кніжка зьмяшчае каля ста мэлёдыяў і тэкстаў. Есьць гэта ня што іншае, як казённая хвальба і гімны Сталіну, Варашылаву і іх саратнікам.

— У пачатку сакавіка адбылася ў Менску надзвычайная сэсія Акадэміі Навук БССР. На сэсіі выбраны звычайным сябрам і прэзыдэнтам Акадэміі Навук — на месца Сурты — Канстанцін Васільлевіч Горев. Нававыбраны прэзыдэнт у 1930 г. скончыў Маскоўскі інстытут каляровых мэталяў, ад 1933 г. — ён дацэнт гэтага інстытуту і кандыдат тэхнічных навук.

Як-ніяк, выбары з такімі кваліфікацыямі „вучонага" на становішча прэзыдэнта Акадэміі Навук — гэтай найвышэйшай савецкай навуковай установы ў Беларусі — ці не зьяўляецца над ёю (Акадэміяй) горкай насьмешкай?! А горш яшчэ — гэты факт сьведчыць аб усіленым тэмпе русыфікатарскай работы Масквы ў Беларусі.

Рэдакцыйная Калегія: др. Ст. Грынкевіч, Ад. Станкевіч, М. Пяцюкевіч, А. Бярозка і мгр. Я. Шутовіч.
Рэдактар-выдавец: мгр. Ян Шутовіч.